Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

17 КАСТРЫЧНІКА 2024 г. ЧАЦВЕР № 203 (30337)

ІНКЛЮЗІЙНАЯ АДУКАЦЫЯ НА ПРАКТЫЦЫ

Сямейная

«СЯМ'Я ГОДА»: ПРА ШЛЯХ ДА ПЕРАМОГІ

Сямейная

ЦЫТАТА ДНЯ

Раман ГАЛОЎЧАНКА, прэм'ер-міністр (на Савеце кіраўнікоў урадаў ШАС):

«Для Беларусі гэта пасяджэнне асабліва. Мы ўпершыню прымаем удзел у ім як паўнапраўны член арганізацыі. Беларусь зрабіла свядомы выбар на карысць членства ў арганізацыі, якая мае стваральны патэнцыял, заснаваны на прынцыпах узаемнага даверу і ўзаемнай выгады дзяржаў, якія з павагай ставяцца да разнастайнасці культур і аддаюць прыярытэт сумеснаму развіццю. Мы гатовы максімальна актыўна ўключацца ва ўсе напрамкі дзейнасці арганізацыі. Як сказаў на саміце ў Астане ў ліпені гэтага года Прэзідэнт Беларусі, мы станем актыўным гульцом шанхайскай каманды, будзем старанна працаваць на карысць далейшага развіцця і ўмацавання гэтай міжнароднай пляцоўкі».

З ПЕРСПЕКТЫВАЙ РОСТУ

Жылыя дамы, пабудаваныя Мазырскім домабудаўнічым камбінатам, карыстаюцца вялікай папулярнасцю не толькі ў родным рэгіёне, але і па ўсёй краіне, бо людзі працуюць сумленна. На здымку: зваршчык арматурных сетак і каркасаў Святлана ОТЧЫК. Яна трапіла на прадпрыемства каля пяці гадоў таму на пасаду прыбіральшчыцы, прайшла навучанне і ўзнялася па кар'ернай лесвіцы да працы на вытворчасці. Цяпер і яе непасрэдны ўклад ёсць у будаўніцтве жылых дамоў найбуйнейшага забудоўшчыка Мазырскага раёна.

Лізавета ГОЛАД, фота аўтара.

Абітурыент-2025

Праверка ведаў — загадзя

У краіне праходзіць першы этап рэпетыцыйнага тэсціравання

Фота Лізаветы ГОЛАД.

Па сутнасці, гэта старт усёй уступнай кампаніі 2025 года. Нягледзячы на тое, што навучальны год толькі пачаўся, будучыя выпускнікі, якія сур'ёзна настроены на навучанне ў беларускіх ВНУ, ужо сёння маюць магчымасць праверыць свае веды на трываласць.

Па традыцыі рэпетыцыйнае тэсціраванне пачалося ў кастрычніку і будзе праходзіць у тры этапы. Першы тур РТ у гэтым навучальным годзе пройдзе ў кастрычніку — снежні 2024-га. Другая стадыя адкрые новы, 2025-ы, год і працягнецца да лютага, а з сакавіка да красавіка наступнага года будзе праходзіць трэці тур.

СТАР. 3

Год якасці

ЛЕКАВАЯ БЯСПЕКА З САЦЫЯЛЬНАЙ НАКІРАВАНАСЦЮ

Доля айчынных прэпаратаў у аптэках павялічваецца

Сёння доля беларускіх лекаў у аптэчнай сетцы складае каля 70 працэнтаў, у шпітальным сектары — 90 працэнтаў. Пры гэтым айчынныя прэпараты ў 2-3 разы таннейшыя за імпартныя. Беларуская фармпрамысловасць вырабляе каля 1750 найменняў лекаў, у тым ліку анкагематалагічныя. Некаторыя вытворцы да 50 % сваёй прадукцыі пастаўляюць на экспарт. Беларускія лекі можна знайсці ў 24 краінах свету. Аднак каб прысутнічаць на замежных рынках, неабходна пастаянна сачыць за якасцю прадукцыі і ўдасканальваць яе. Пра новыя распрацоўкі, запатрабаванасць у суседзяў і высокія патрабаванні да якасці, без якіх не выжыць, расказалі спецыялісты.

У 2-3 разы таннейшыя за імпартныя

Прамысловы выпуск фармацэўтычнай прадукцыі ў нашай краіне ажыццяўляюць 35 прадпрыемстваў усіх форм уласнасці: і дзяржаўнай, і прыватнай. Прычым дзяржаўныя прадпрыемствы забяспечваюць палову вытворчасці на рынку Беларусі і 70 працэнтаў усіх экспартных адгрузак, якія ажыццяўляе фармацэўтычная прамысловасць краіны.

Як паведаміў **генеральны дырэктар РУП «Кіруючая кампанія холдынга «Белфармпрам» Ігар МІТРАФАНАЎ,** на працягу апошніх гадоў доля беларускіх лекаў на ўнутраным рынку ў вартасным выяўленні падтрымліваецца на ўзроўні не менш як 50 працэнтаў. Гэта адзін з самых высокіх паказчыкаў у параўнанні з унутранымі рынкамі сумежных краін.

СТАР. 3

КАРОТКА

- **Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Дзмітрый Крутой 16 кастрычніка сустрэўся з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Кітайскай Народнай Рэспублікі ў нашай краіне Чжан Вэньчуанем, павіншаваў яго з пачаткам дыпламатычнай місіі ў Беларусі і пажадаў поспехаў у дзейнасці на карысць дзвюх краін.**
- На конкурс «Кіно маладых» фестывалю «Лістапад» даслана 975 работ з больш як 90 краін.
- **Заканчэнне будаўніцтва буйной зоны чакання паблізу ад «Казловічаў» плануецца да канца 2025 года.**

ISSN 1990 — 763X

Парламенцкі дзённік

Актыўнасць і сувязь з выбаршчыкамі

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў наведалі Гомельшчыну

Выязны семінар Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь на чале са Старшынёй Ігарам СЕРГЯЁНКАМ прайшоў у Светлагорскім раёне Гомельскай вобласці. Перш за ўсё парламентарыі наведалі мемарыяльны комплекс «Ала» і разам з кіраўніцтвам вобласці і раёна ўсклалі кветкі да падножжа крыжа і брацкага пахавання на знакавым для краіны месцы памяці.

Працягам візіту стала знаёмства з вытворчымі аб'ектамі Светлагоршчыны. Гасцей сустрэлі на прадпрыемстве таварыства з абмежаванай адказнасцю «Амета-Электрод». Прадпрыемства ўваходзіць у склад расійскага холдынга і з'яўляецца найбуйнейшым вытворцам зварачных матэрыялаў на тэрыторыі СНД. Як распавёў дырэктар ТАА «Амета-Электрод» Максім Раманенка, вытворчасць арыентавана на рынак Беларусі і цэнтральнай часткі Расійскай Федэрацыі.

— Вытворчая магутнасць прадпрыемства — 700 тон прадукцыі за месяц. Працаўладкавана ў нас звыш 140 чалавек. Складзена інвестыцыйная праграма далейшага развіцця вытворчасці, якую плануем рэалізаваць да 2027 года. Наша задача ў гэтым кірунку — адкрыць новы дазіровачны комплекс. Бо сёння вытворчасць залежыць у тым ліку ад паставак з нашага галаўнога прадпрыемства ў Магнітагорску. Увод новага комплексу дазволіць забяспечыць у Светлагорску поўны вытворчы цыкл, — паведаміў Максім Раманенка.

Наступным пунктам выязнога семінара Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі стала наведванне вытворчага флагмана Гомельшчыны — ААТ «СветлагорскХімвалакно». Парламентарыі на свае вочы змаглі ўбачыць работу новых ліній і паназіраць за вытворчым працэсам у цэху па выпуску поліэтыленавай плёнкі для мяккай тары. У цэнтры ўвагі была і новая вытворчасць па выпуску латэксных пальчатак, запушчаная два гады таму па даручэнні кіраўніка дзяржавы.

На важнасці праектаў, якія сёння рэалізуюцца на прадпрыемстве, Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Ігар Сергяенка акцэнтаваў увагу падчас сустрэчы з працоўным калектывам «СветлагорскХімвалакно».

— Фактычна ўсе плановыя заданні, якія былі вызначаны для прадпрыемства канцэрнам, урадам, выконваюцца. Калі выконваюцца плановыя заданні, то забяспечваецца і ўзровень заработнай платы, вырашаюцца сацыяльныя пытанні не толькі на вашым прадпрыемстве, але і ў рэгіёне, краіне, — зазначыў Ігар Сергяенка. — Сёння па вытворчасці поліэфірных нітак — у тым ліку гэта датычыцца і вашай вытворчасці — у рамках СНД Беларусь забяспечвае выпуск 50 % гэтай прадукцыі. Наша краіна выйшла на ўзровень забеспячэння 80 % машынна-трактарнай тэхнікі, 20 % халадзільнікаў. Толькі ў гэтым годзе валавы ўнутраны прадукт склаў 104,9 %.

Ігар Сергяенка нагадаў, што ўдзельная вага Гомельшчыны ў агульным аб'ёме прамысловасці краіны складае 20 %.

— Сёння маюцца ўсе ўмовы, каб перабудаваць лагістычныя ланцужкі, у тым ліку па атрыманні сыравіны. 9 % валавога ўнутранага прадукту краіны, які фарміруецца, выкарыстоўваецца для выплаты пенсій і дапамог. Гэта на ўзроўні высокаразвітых краін. Практычна два разы на год адбываецца павелічэнне пенсій нашым ветэранам, — дадаў Ігар Сергяенка.

Работнікі прадпрыемства ў сваю чаргу змаглі задаць пытанні Старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі. Гутарка зайшла пра рэалізацыю прадукцыі па дзяржзаказе, заканатворчую дзейнасць, інфармацыйную бяспеку.

— Мы жывём у няпросты час. Упершыню за пасляваенны перыяд свет уступіў у паласу наймацнейшага ваенна-палітычнага крызісу. Сёння фактычна некалькі гарачых зон на мяжы пачатку новай сусветнай вайны, — звярнуў увагу спікер.

Ігар Сергяенка адзначыў, што не можа не хваляваць і сітуацыя, якая разгортваецца каля беларускіх граніц: Польшча ўзмацняе ваенную прысутнасць блока НАТА, на тэрыторыі Літвы пачынаецца чарговы этап вучэнняў, у якім задзейнічаны як тэрытарыяльныя падраздзяленні, так і вайскоўцы блока НАТА.

— Мы, з аднаго боку, забяспечваем сваю бяспеку, умацоўваем Узброеныя Сілы, ваенна-прамысловы комплекс, перадыслацыруем асобныя часткі для выканання задач. З другога боку, дэманструем адкрытасць сваёй тэрыторыі для жыхароў краін Еўропы. Па рашэнні кіраўніка дзяржавы ўведзены бязвізавы рэжым для ўезду ў нашу краіну, — нагадаў Ігар Сергяенка.

На тэрыторыі заводаўпраўлення «Светлагорск-Хімвалакно» прайшла сустрэча Ігара Сергяенкі з актывам Гомельскай вобласці. Спікер падкрэсліў, што падобныя выязныя семінары, падчас якіх парламентарыі знаёмяцца з рэгіёнамі, наладжваюць кантакты з мясцовымі органамі ўлады, жыхарамі на месцах, вельмі важныя. Падобныя семінары прайшлі таксама ў іншых абласцях.

На сустрэчы з актывам Гомельшчыны Ігар Сергяенка падзяліўся, наколькі крануладзя для ўдзельнікаў семінара стала наведванне мемарыяльнага комплексу «Ала». Старшыня Палаты прадстаўнікоў адзначыў вялікі ўклад Гомельскай вобласці ў захаванне гісторыка-культурнай спадчыны краіны.

Асобны акцэнт Ігар Сергяенка зрабіў на сумеснай рабоце парламентарыяў і арганаў улады на месцах. Сёння Гомельшчыну ў Палаце прадстаўнікоў прадстаўляюць 17 дэпутатаў. Пераважная большасць народных абраннікаў упершыню ўключыліся ў заканатворчую дзейнасць. Ігар Сергяенка адзначыў актыўную работу дэпутатаў з жыхарамі выбарчых акруг, узаемадзеянне са сродкамі масавай інфармацыі.

За перыяд вясновай сесіі дэпутатамі прынята 36 законапраектаў. З пачатку восеньскай сесіі — ужо 13, некаторыя законы ўступілі ў дзеянне. Сярод іх — новая рэдакцыя Закона аб ветэранах, які прадугледжвае ўзмацненне сацыяльных льгот і гарантый для ветэранаў вайны і працы, былых вязняў фашызму, воінаў-інтэрнацыяналістаў, членаў сем'яў загінулых пры выкананні воінскіх абавязкаў.

Ігар Сергяенка зрабіў акцэнт на ролі дэпутатаў у вырашэнні пытанняў сацыяльна-эканамічнага, грамадска-палітычнага развіцця рэгіёнаў.

— Упэўнены, што правядзенне падобных сустрэч і знаёмстваў з рэальным сектарам эканомікі, знаёмства са слаўнымі гераічнымі традыцыямі дапаможа павысіць ролю дэпутата, павысіць яго актыўнасць і сувязь з выбаршчыкамі ў канкрэтным рэгіёне, — рэзюмаваў спікер.

Наталля КАПРЫЛЕНКА, фота аўтара.

г. Светлагорск.

Міжнародны вектар

Ключавы партнёр на Балканах

Ігар СЕРГЯЕНКА правёў сустрэчу з паслом Сербіі ў Беларусі

Старшыня Палаты прадстаўнікоў павіншаваў Іліну Вукайлавіч з пачаткам дыпламатычнай місіі ў нашай краіне. Спікер выказаў упэўненасць у тым, што яе веды, вопыт, непадробная цікавасць да Беларусі, энтузіязм і жаданне ўсяляк садзейнічаць развіццю ўсебаковых адносін з нашай краінай, унясуць уклад у прадаўжэнне супрацоўніцтва.

«Нас звязвае многае: не толькі сучаснасць, але і мінулае, — звярнуў увагу Ігар Сергяенка. — Сербія для нас з'яўляецца ключавым партнёрам на Балканах. Фактычна адзіная краіна, з якой у нас функцыянуе ў Еўропе бязвізавы рэжым і існуе дагавор аб свабодным гандлі. Мы прытрымліваемся прынцыпу тэрытарыяльнай цэласнасці сербскай дзяржавы, падтрымліваем пазіцыю Сербіі па адчувальных пытаннях на міжнародных пляцоўках. І, вядома, разлічваем на такую падтрымку, такія адносіны і з вашага боку».

Спікер адзначыў, што апошнім часам намеціліся станоўчыя тэндэнцыі ў плане актывізацыі кантактаў паміж краінамі. У тым ліку гэта датычыцца парламенцкай лініі. Ігар Сергяенка нагадаў, што некалькі тыдняў таму ў Палаце прадстаўнікоў адбылася сустрэча з намеснікам старшыні Народнай скупшчыны Сербіі. Дыялог атрымаў развіццё: на мінулым тыдні старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Сяргей Рачкоў знаходзіўся з візітам у Сербіі, дзе ў тым ліку прымаў удзел у сустрэчы са старшынёй Народнай скупшчыны гэтай краіны.

«Я атрымаў пасланне спадарыні старшыні, у якім абазначаны дакладны пасыл да развіцця даверлівых, сяброўскіх адносін, супрацоўніцтва паміж заканадаўчымі органамі і Сербіі, і Беларусі, — паведаміў Старшыня Палаты прадстаўнікоў. — Сведчаннем гэтаму з'яўляецца і фарміраванне груп сяброўства. Мы разлічваем на аднаўленне актыўных кантактаў. Тым больш што сёлета ў лістападзе мы адзначым знакавую дату — 30-годдзе ўстанаўлення дыпламатычных адносін».

Кажучы аб агульнай гісторыі, Ігар Сергяенка павіншаваў пасла з 80-годдзем вызвалення Бялграда ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, якое будзе адзначацца 20 кастрычніка. Спікер заўважыў, што шэсць тысяч нашых суайчыннікаў ваявалі на тэрыторыі тагачаснай Югаславіі і дапамагалі хутчэйшаму ўстанаўленню міру на гэтай зямлі.

Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Сербія ў Рэспубліцы Беларусь Іліна ВУКАЙЛАВІЧ перадала спікеру прывітальныя словы ад старшыні сербскага парламента Аны Брнабіч. «Беларусь для нас вельмі блізкая краіна, традыцыйна сяброўская, — падкрэсліла пасол. — У нас вельмі добрыя адносіны паміж народамі. Калі мяне прызначылі сюды паслом, нашы людзі прыходзілі і выказвалі асаблівыя адносіны да Беларусі. Яны цудоўна памятаюць і візіт вашага Прэзідэнта ў самыя цяжкія для нас часы. Гэта для нас з'яўляецца вельмі важным, значным. Таму, вядома, збіраемся рабіць яшчэ больш, развіваць яшчэ глыбей наша сумеснае супрацоўніцтва».

У размове з журналістамі Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Сербія ў Рэспубліцы Беларусь паведаміла, што паміж краінамі адкрываецца вельмі шмат кірункаў для супрацоўніцтва. «У Беларусі моцныя прадпрыемствы, — звярнула ўвагу дыпламат. — У Сербіі па вельмі многіх кірунках станоўчыя вынікі. Сербія з'яўляецца самай хуткай эканомікай, якая расце, у нашым рэгіёне. А ў першым квартале гэтага года мы — краіна з эканомікай, якая найбольш хутка расце ў Еўропе. У нас праходзяць вельмі вялікія форумы ў навуковай сферы, а ў Беларусі вельмі высокі навуковы патэнцыял. І медыцына ў вас добрая, сістэма аховы здароўя. Мы спрабуем развіваць абсалютна ўсе кірункі нашага супрацоўніцтва на карысць нашых народаў і нашых двухбаковых адносін».

Вераніка КАНЮТА.

Умацаванне парламенцкага дыялогу

Сяргей АЛЕЙНІК прымае ўдзел у мерапрыемствах 149-й Асамблеі Міжпарламенцкага саюза

Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы максімальна выкарыстоўвае магчымасці 149-й Асамблеі МПС, якая праходзіць у Жэневе, для абмеркавання актуальных пытанняў развіцця шматбаковага і двухбаковага супрацоўніцтва.

У прыватнасці, Сяргей Алейнік прыняў удзел у пасяджэнні геапалітычнай групы «Еўразія». Сенатар выказаўся ў падтрымку заяўкі на атрыманне ПА АДКБ статусу назіральніка ў геапалітычнай групе МПС «Еўразія». Падчас мерапрыемства ўдзельнікі абмяняліся думкамі па шэрагу пытанняў парадку дня бягучай асамблеі, у тым ліку па прапанове групы арабскіх дзяржаў аб уключэнні тэрміновага пункта па канфлікце на Блізкім Усходзе. Сяргей Алейнік праінфармаваў аб падыходах беларускага боку да прапановы аб уключэнні тэрміновага пункта, а таксама заклікаў членаў геапалітычнай групы Еўразія разгледзець магчымасць прыняцця на 150-й Асамблеі МПС заявы ў азнаменаванне 80-й гадавіны Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Адпаведная прапанова Беларусі будзе афіцыйна накіравана старшынёй групы «Еўразія» яе членам.

На палях асамблеі сенатар сустрэўся са спікерам Федэральнага Нацыянальнага Савета Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў Сакрам Габашам. У фокусе ўвагі сустрэчы — умацаванне парламенцкага дыялогу паміж Беларуссю і ААЭ.

Сяргей Алейнік прыняў удзел у пасяджэнні Выканаўчага камітэта і адкрыцці агульных дэбатаў на 149-й Асамблеі Міжпарламенцкага саюза. На палях гэтых мерапрыемстваў Сяргей Алейнік абмеркаваў шэраг пытанняў двухбаковага парламенцкага парадку дня з Генеральным сакратаром Міжпарламенцкага саюза Марцінам Чунгонгам, Спікерам Мілі Меджліса Азербайджанскай Рэспублікі Сагібай Гафаравай, намеснікам Старшыні Савета Федэрацыі Федэральнага Сходу Расійскай Федэрацыі Канстанцінам Касачовым. Акрамя таго, старшыня Пастаяннай камісіі правёў двухбаковыя сустрэчы з кіраўнікамі парламенцкіх дэлегацый. Адбыўся абмен думкамі па пытаннях, якія разглядаюцца на Асамблеі МПС, актуальных напрамках развіцця двухбаковых адносін, дасягнуты дамоўленасці аб актывізацыі міжпарламенцкага дыялогу, у тым ліку шляхам стварэння груп дружбы і арганізацыі ўзаемных візітаў.

Выступаючы падчас дыскусіі ў Пастаяннам камітэце па ўстойлівым развіцці на 149-й Асамблеі МПС, Сяргей Алейнік падкрэсліў актуальны характар ініцыятывы Рэспублікі Беларусь, агучанай Прэзідэнтам Аляксандрам Лукашэнкам, аб неабходнасці пачатку глабальнага дыялогу па бяспецы, паведаміў аб памкненнях Беларусі перазапусціць важныя працэсы ў сферы міжнароднай бяспекі, у тым ліку праз сумесны пошук эфектыўных доўгатэрміновых рашэнняў у рамках Міжнароднай канферэнцыі па еўразійскай бяспецы. Сенатар падкрэсліў важную ролю парламенцкіх стратэгій у справе папярэджання і ўрэгулявання канфліктаў.

Паводле прэс-службы Савета Рэспублікі.

ЛЕКАВАЯ БЯСПЕКА З САЦЫЯЛЬНАЙ НАКІРАВАНАСЦЮ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У аб'ёме спажывання ва ўмоўных упакоўках у натуральным выяўленні доля беларускіх лекаў у аптэчнай сетцы складае каля 70 працэнтаў, у шпітальным сектары — 90 працэнтаў. Гэта абумоўлена значнай, у сярэднім у 2-3 разы, розніцай у цэнах на імпартныя і айчынныя прэпараты.

Сёння ў Беларусі зарэгістравана каля 4,2 тысячы лекавых прэпаратаў, з якіх 1750 выпускаюць беларускія вытворцы. Такім чынам, айчынная фармацэўтычная прамысловасць забяспечвае лекавую бяспеку дзяржавы, што з'яўляецца адным са складнікаў яго ўстойлівага развіцця.

— Па выніках работы за 2024 год, зыходзячы з нашых прагнозаў, мы чакаем аб'ём вытворчасці фармацэўтычнай прадукцыі больш як на два мільярды рублёў з тэмпам росту 113,4 працэнта да ўзроўню 2023 года. Экспарт чакаецца каля 200 мільёнаў долараў. У рамках плана мерапрыемстваў па імпартазамяшчэнні ўсімі прадпрыемствамі будзе выпушчана імпартазамяшчальнай прадукцыі ў выглядзе лекавых прэпаратаў на суму 650 мільёнаў долараў, — расказаў Ігар Мітрафанаў.

Каб прадукцыя была запатрабавана на знешніх рынках, фармвытворцы зацікаўлены ў інвестыцыйным развіцці, мадэрнізацыі дзеючых вытворчасцяў, пляцовак. Сёння, згодна з праграмай развіцця да 2030 года, рэалізуюцца 22 інвестыцыйныя праекты агульным коштам звыш 900 мільёнаў. Гэта 18 праектаў у сферы вытворчай дзейнасці, тры — па мадэрнізацыі і будаўніцтве новых складскіх памяшканняў і адзін — праект па будаўніцтве лабараторыі.

Прапрацоўваецца таксама магчымасць лакалізацыі на беларускіх фармацэўтычных пляцоўках вытворчасці прэпаратаў з партфеляў замежных кампаній. На сёння вядуцца перагаворы з дзесяццю кампаніямі з Расіі, Ірана, Кітая, Кубы. У прапрацоўцы знаходзіцца не менш як 21 запатрабаваны прэпарат.

Усяго ж за апошнія пяць гадоў асвоена і зарэгістравана на рынку 429 лекавых прэпаратаў.

— Прааналізаваўшы рынак Беларусі па лекавых прэпаратах, хачу адзначыць, што ў топ-10 па продажах у натуральным выяўленні восем кампаній прадстаўлены беларускімі вытворцамі. Калі разгледзець гэтую сітуацыю з пункту гледжання топу продажаў у вартасным выяўленні, тут застаецца шэсць кампаній, — адзначыў Ігар Мітрафанаў, патлумачыўшы, што беларускія прэпараты значна танейшыя за імпартныя.

Так, каля 50 працэнтаў наменклатуры, што выпускаецца айчыннымі прадпрыемствамі, — гэта лекавыя прэпараты коштам да 2 долараў, каля 26 працэнтаў — да 1 долара, што сведчыць аб сацыяльнай накіраванасці беларускай фармпрамысловасці.

Прадпрыемствы вядуць актыўную дзейнасць па рабоце на агульнай Еўразійскай прасторы ў адпаведнасці з новымі патрабаваннямі. У прыватнасці, у апошнія гады вытворчасці аснасцілі новым абсталяваннем для нанясення лічбавай маркіроўкі.

Ігар Мітрафанаў адзначыў, што на дзяржаўных прадпрыемствах, якія ўваходзяць у холдынг «Белфармпрам», працуе каля 7,1 тысячы чалавек, 76 % складаюць жанчыны. Усе прадпрыемствы працуюць прыбыткова і ўстойліва.

Экспарт у 20 краін свету

Два дастаткова буйныя інвестыцыйныя праекты рэалізуюцца РУП «Белмедпрэпараты». Першы — па мадэрнізацыі вытворчасці кропель для вачэй, другі — стварэнне вытворчасці анкалагічных ліяфільна высушаных лекавых прэпаратаў. Рэалізацыя гэтых праектаў дасць магчымасць у поўнай меры задаволіць попыт на ўнутраным рынку, а таксама пашырыць геаграфію экспарту.

Адзін з найбуйнейшых айчынных фармвытворцаў выпускае і больш як 320 найменняў лекавых прэпаратаў. Агульны аб'ём вытворчасці ў год складае больш як 350 мільёнаў рублёў. Каля 40 працэнтаў ад аб'ёму выпрабленай прадукцыі адгружаецца на экспарт — у больш як 20 краін. Самымі буйнымі партнёрамі традыцыйна з'яўляюцца Расія, Узбекістан, Казахстан, В'етнам, Іран.

Адпаведна каля 60 працэнтаў вырабленай прадпрыемствам прадукцыі застаецца на рынку Беларусі: палова рэалізуюцца праз аптэчную сетку, астатняе — праз дзяржзакупкі для шпітальнага сегмента.

Як адзначыў **генеральны дырэктар РУП «Белмедпрэпараты» Аляксандр ЖАДАН,** штогод прадпрыемства асвойвае вытворчасць і выпускае каля 10 новых лекавых прэпаратаў. На прадпрыемстве ўдзяляецца вялікая ўвага развіццю новых кірункаў, інавацыям, кантролю якасці прадукцыі. Сёння лекі выпускаюцца на пяці вытворчых пляцоўках: дзвюх буйных у Мінску, а таксама ў Лідзе, Скідзелі, Бешанковічах.

Якасць пачынаецца з упакоўкі

Нясвіжскі завод медыцынскіх прэпаратаў спецыялізуецца на выпуску стэрыльных інфузійных растворaў. Яны выкарыстоўваюцца як самастойна, так і ў якасці носьбітаў іншых лекавых сродкаў, якія трэба ўвесці непасрэдна ў крывяносную сістэму.

Цяпер у асартыментным партфелі прадпрыемства 36 найменняў прэпаратаў. З улікам дазіровак і формаў выпуску вырабляецца каля 100 відаў прадукцыі. У асноўным яна прызначана для шпітальнага сектара, гэта значыць, выкарыстоўваецца ў бальніцах. Невялікая частка прадукцыі паступае ў аптэкі.

Як адзначыў **дырэктар ААТ Нясвіжскі завод медыцынскіх прэпаратаў» Генадзь ЖЫВЕНЬ,** 70 працэнтаў прадукцыі прадпрыемства каштуе да 2 рублёў, яшчэ 14,6 працэнта — ад 2 да 3 рублёў.

— Мы перайшлі на першасную ўпакоўку амаль на 100 % айчыннай вытворчасці. Гумавы корак атрымліваем з Кітая, нашы кітайскія калегі даволі нядрэнна з намі супрацоўнічаюць, — падзяліўся Генадзь Жывень. — Да першаснай упакоўкі прад'яўляюцца вельмі высокія патрабаванні. Яна павінна быць інертная. Гэта значыць, ніякага ўплыву на раствор. Пры ўзаемадзеянні з першаснай упакоўкай не павінна быць ніякай рэакцыі, таму патрабаванні да вытворцаў вельмі высокія.

Завод закупіў лінію па поўным цыкле вытворчасці ўпакоўкі — бутэлек, мяккіх палімерных пакетаў. Увогуле, прадпрыемства пастаянна мадэрнізуецца. Апошнім часам пабудаваны склад сыравіны і матэрыялаў, які адпавядае ўсім сучасным патрабаванням, новая мікрабіялагічная лабараторыя, цалкам мадэрнізавана хімічная лабараторыя. У стадыі завяршэння будаўніцтва біялагічнай лабараторыі, якую плануецца здаць сёлета. Вялікую ўвагу тут удзяляюць якасці прадукцыі і яе кантролю.

Уласныя распрацоўкі для лячэння пухлін

Прадпрыемства «Акадэмфарм» створана з мэтай забяспечыць беларусаў высакаякаснымі прэпаратамі — аналагамі прэпаратаў сусветнай фармацэўтычнай прамысловасці. Сёння яно выпускае 45 прэпаратаў, прычым забяспечвае не толькі рынак нашай краіны, але і нарошчвае экспартныя пастаўкі ў Расію. Некалькі прэпаратаў з'яўляюцца арыгінальнымі і створаны сумесна з калегамі з Інстытута біяарганічнай хіміі НАН. Яны вырабляюцца ў Беларусі па поўным цыкле. На прадпрыемстве рэалізуюцца два вялікія інавацыйныя праекты. У прыватнасці, будуецца новы цэх, дзе плануюць выпускаць больш чым 35 новых прэпаратаў.

На выпуску анкагеметалагічных прэпаратаў спецыялізуецца прадпрыемства «ХімФармСінтэз». Калісьці тут пачыналі з вытворчасці субстанцый, цяпер перайшлі на выпуск гатовых лекавых форм. Фармвытворца мае тры пляцоўкі, першая з якіх вырабляе фармацэўтычныя субстанцыі, другая — ін'екцыйныя растворы, трэцяя — цвёрдыя лекавыя формы ў выглядзе капсул і таблетак.

— Летась зарэгістраваны два новыя таргетныя прэпараты для лячэння нырак і страмальных пухлін. Іх інавацыйнасць у тым, што нягледзячы на тое, што яны ўзнаўляюць малекулы вядомых брэндаў, тэхналогія атрымання субстанцый і атрыманне гатовых лекавых форм — нашы ўласныя распрацоўкі, — расказала **намеснік дырэктара па навуковай і інавацыйнай рабоце — начальнік НПЦ «ХімФармСінтэз» Алена КАЛІНІЧЭНКА,** дадаўшы, што каля 50 % прадукцыі пастаўляецца на рынак Расіі, а само прадпрыемства ўваходзіць у топ-10 вытворцаў, якія працуюць на экспарт.

Алена КРАВЕЦ.

Праверка ведаў — загадзя

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Праверыць свае веды будучыя абітурыенты змогуць па 15 прадметах: беларуская і руская мова, матэматыка, фізіка, хімія, біялогія, гісторыя Беларусі, сусветная гісторыя, геаграфія, замежная мова (англійская, нямецкая, французская, іспанская, кітайская), грамадазнаўства. Пералік устаноў адукацыі, на базе якіх адкрываюцца пункты правядзення тэсціравання, будзе папаўняцца па меры таго, як з установамі адукацыі будуць заключацца адпаведныя дагаворы. Спецыялісты звяртаюць увагу ўдзельнікаў РТ на тое, што па яго выніках сертыфікаты не выдаюцца. Мэта такога тэсціравання — даць магчымасць будучым абітурыентам паспрабаваць свае сілы ў выкананні заданняў, якія ім давядзецца вырашаць як на цэнтралізаваным экзамене, так і на галоўным тэсціраванні. Школьнікі змогуць не толькі рэальна ацаніць свае веды, але і параўнаць атрыманыя на тэсціраванні вынікі са школьнымі ацэнкамі па прадмеце.

Першай ахвотных праверыць свае веды прыняла галоўная ВНУ краіны: 8 кастрычніка іспыты пачаліся ў ліцэі БДУ імя Ф. Э. Дзяржынскага і працягваліся ўвесь тыдзень, у тым ліку і ў выхадныя дні. 14 кастрычніка эстафету прыняў Інстытут дадатковай адукацыі БДУ, следам падключыліся іншыя ВНУ краіны.

Мы звязаліся з **начальнікам навучальнага цэнтра даўніверсітэцкай падрыхтоўкі Інстытута дадатковай адукацыі БДУ Вадзімам МІЦЯНКОВЫМ**, каб даведацца, як праходзіць першы этап рэпетыцыйнага тэсціравання.

— Вадзім Іванавіч, у каго першы этап тэсціравання выклікаў найбольшую цікавасць?

— Мяркуючы па тым, што ўсе месцы для праходжання іспытаў былі поўнасцю запоўнены, попыт на гэты від папярэдняга выпрабавання не падае. У пераважнай большасці заяўкі на яго падалі старшакласнікі — будучыя выпускнікі і абітурыенты, а таксама выпускнікі мінулых гадоў, якія не паступілі ў ВНУ. Паспрабаваць свае сілы па рускай мове прыходзілі і дзевяцікласнікі. Скажу больш: на рэпетыцыйнае тэсціраванне прыходзяць і настаўнікі сярэдніх школ. Нават бацькі школьнікаў выказвалі жаданне прайсці яго. Каб дзяцей падтрымаць, ды і свае веды праверыць — ім жа таксама пэўным чынам трэба прайсці праз усе ўступныя іспыты...

— Рэпетыцыйнае тэсціраванне праходзіць не адзін год. Колькі ўдзел у ім уплывае на вынікі цэнтралізаванага тэсціравання? Ці ёсць прагрэс?

— Мяркуйце самі, у 2024 годзе на цэнтралізаваным тэсціраванні 695 работ атрымалі 100 балаў, летась гэтая лічба была 600. Вядома, прагрэс ёсць. І, вядома, пэўная доля ўкладу ў яго — за рэпетыцыйным тэсціраваннем. Удзел у ім дазваляе старшакласнікам пазнаёміцца з тэматыкай тэставых заданняў, праверыць узровень ведаў па выбраных вучэбных прадметах і пракантраляваць дынаміку ўстарання недахопаў па раней вывучаным матэрыяле, а таксама вызначыцца з выбарам прафесіі і ўстановы адукацыі для паступлення.

Акрамя таго, ёсць шэраг так званых тэхнічных пытанняў, якія на асноўным іспыце могуць адабраць і нервы, і час. На рэпетыцыйным тэсціраванні можна і важна «адрэпеціраваць» тэхналогію запаўнення бланка, адмены адказаў і гэтак далей. Акрамя таго, абітурыент, прайшоўшы РТ, будзе ведаць, колькі часу адведзена на праходжанне таго ці іншага тэсту, і падрыхтуецца так, каб у гэты час укласціся.

— Якія прадметы на рэпетыцыйным тэсціраванні самыя папулярныя?

— Руская мова, матэматыка, англійская мова, грамадазнаўства. На жаль, колькасць удзельнікаў па беларускай мове мае тэндэнцыю да зніжэння. Але ёсць і станоўчы момант — гэта сведомы выбар абітурыентаў, якія здаюць беларускую мову. Як вынік — дастаткова высокі сярэдні бал па гэтым прадмеце на цэнтралізаваным тэсціраванні 2024 года — 40,6 бала.

А зараз — некалькі важных нюансаў для тых, хто толькі рыхтуецца да рэпетыцыйнага тэсціравання. Умовы на РТ такія ж, як і на ЦТ, спазняцца на «рэпетыцыю» нельга. На выкананне кожнага тэста даецца розная колькасць часу. Напрыклад, па 90 хвілін — для напісання тэстаў па гісторыі Беларусі, грамадазнаўстве, сусветнай гісторыі і геаграфіі. У тэстах па гэтых прадметах — па 38 заданняў: 16 — у частцы «А», 22 — у частцы «В». Найбольшая колькасць часу прадугледжана на здачу фізікі і матэматыкі — па 210 хвілін, пры гэтым там усяго 30 заданняў — у суадносінах 10 да 20 у разрэзе частак «А» і «В». З замежнымі мовамі трэба справіцца за 120 хвілін. Пры гэтым тут у тэстах больш за ўсё заданняў — сорак: 18 — з часткі «А», 22 — з часткі «В».

Апрацоўка бланкаў адказаў і выдача вынікаў ажыццяўляецца па той жа тэхналогіі, што і ў ходзе ЦТ. Пасля заканчэння рэпетыцыйнага тэсціравання кожны ўдзельнік атрымлівае рашэнне заданняў. Такім чынам даецца магчымасць правесці работу над памылкамі і падцягнуць слабыя месцы перад тым, як ісці на ЦТ.

Алена ВІНАГРАДАВА.

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў працуюць у рэгіёнах

«Не бывае нязначных праблем»

Задача народнага выбранніка — прапусціць кожны зварот праз асабістую прызму

Лічыць дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Алена ПАРХІМЧЫК. За аснову сваёй парламенцкай работы з першых дзён яна ўзяла наступную цытату Прэзідэнта Беларусі: «Наша галоўная каштоўнасць — народ. Менавіта таму дзяржаўная палітыка падпарадкоўваецца прынцыпу: усё на карысць чалавека. Ніякія ніты і гайкі дзяржаве і ўладзе не патрэбны, калі гэта не будзе працаваць на чалавека. Гэта інструкцыя да дзеяння для ўсіх органаў улады. Таму што рэспубліка з'яўляецца сапраўды народнай!». Гэтага прынцыпу парламентарый прытрымліваецца і цяпер, імкнучыся вырашаць праблемы выбаршчыкаў Пухавіцкай выбарчай акругі № 65.

У склад акругі ўваходзяць Пухавіцкі і Старадарожскі раёны, а таксама Сарагскі і Першамайскі сельсаветы Слуцкага раёна. З праблемамі і спецыфікай сваёй акругі дэпутат Алена Генадзьеўна знаёмая даўно, нягледзячы на тое, што работа ў Палаце прадстаўнікоў для парламентарыя ў навінку. Два скліканні запар яна была дэпутатам Пухавіцкага раённага Савета, таму выбаршчыкі актыўна падтрымалі кандыдатуру Пархімчык і падчас Адзінага дня галасавання.

«У сваёй выбарчай праграме ставіла акцэнты на вырашэнне праблем, якія хвалююць насельніцтва. Шмат прапаноў і пажаданняў было агучана людзьмі падчас сустрэч у калектывах, і на сёння многія з іх удалося вырашыць», — расказвае дэпутат.

Акрамя тыповых праблем — добраўпарадкавання дваровых тэрыторый і рамонту дарог, — Алена Генадзьеўна плённа працуе ў галіне аховы здароўя, бо прафесійны шлях дэпутата быў цесна звязаны з медыцынай: амаль 12 гадоў Пархімчык займала пасаду галоўнага ўрача Пухавіцкага раённага цэнтра гігіены і эпідэміялогіі.

Недахоп урачоў у раённых цэнтрах выклікаў у насельніцтва складанасці з медыцынскімі абследаваннямі, жыхары Пухавіцкага раёна былі вымушаны ездзіць па медыцынскія паслугі ў Мінск, Слуцкага — у Салігорск. У Старадарожскім раёне не было магчымасці прайсці ўльтрагукавое даследаванне, сёння гэта праблема вырашана.

«У Пухавіцкім раёне востра стаяў недахоп урачоў вузкіх спецыяльнасцяў, такіх як афтальмолаг, стаматолаг-хірург, траўматолаг і шэраг іншых, літаральна некалькі дзён таму я сустракалася з насельніцтвам раёна, і людзі дзякавалі, бо спецыялісты з'явіліся. Актыўная работа сумесна з кіраўніцтвам раёнаў і цэнтральных раённых бальніц дала свае вынікі: цяпер мясцовыя жыхары могуць у поўным аб'ёме атрымліваць неабходныя паслугі, не выязджаючы са сваіх раёнаў», — дзеліцца парламентарый.

У Старых Дарогах цяпер з'явіўся ўрач, які спецыялізуецца на ўльтрагукавым даследаванні, шэраг урачоў вузкіх спецыяльнасцяў. У маі бягучага года ў горадзе Мар'іна Горка адкрыўся медыцынскі цэнтр «МарыяМед», перагаворы наконт з'яўлення такога цэнтра Алена Пархімчык вяла з прадстаўнікамі кампаніі яшчэ на пасадзе галоўнага ўрача. «Мы ўжо атрымалі пазітыўныя водгукі ад насельніцтва аб неабходнасці і зручнасці такой установы, таму з улікам сітуацыі, якая склалася ў Старадарожскім раёне, плануем адкрыць падобны цэнтр і ў горадзе Старыя Дарогі. Вядзецца пошук неабходнага будынка і абмяркоўваецца шэраг медыцынскіх паслуг, якія будуць аказвацца жыхарам», — расказвае аб перспектывах жанчына.

Бягучы тыдзень дэпутата ў акрузе распісаны, як і заўсёды, па гадзінах. Але, акрамя звыклых прыёмаў грамадзян, прамых тэлефонных ліній і сустрэч з працоўнымі калектывамі, менавіта гэтыя дні супалі з Тыднем бацькоўскай любові, які таксама знайшоў сваё адлюстраванне ў рабочым графіку. 14 кастрычніка Алена Генадзьеўна сустракалася з насельніцтвам Старадарожскага сельсавета, тэмай адкрытага дыялогу стала ў тым ліку захаванне традыцыйных сямейных каштоўнасцяў і рэгіянальнае развіццё, умовы для стварэння сям'і. Падчас раённага святочнага канцэрта, які адбыўся ў гэты дзень, віншаванні ад дэпутата прымала жанчына, якая выхоўвае пяцярых дзяцей. Своеасаблівае шэфства над гэтай сям'ёй па асабістай ініцыятыве Алена Пархімчык узяла на самым пачатку дэпутацкай дзейнасці. Такая сям'я ёсць і ў Пухавіцкім раёне, дзе выхоўваюцца трое сваіх і двое прыёмных дзетак, марафон добрых спраў у аўторак даехаў і да гэтай сям'і.

Часта да парламентарыя прыходзяць людзі з асабістымі праблемамі, калі звароты ў іншыя інстанцыі не далі вынікаў. Так, у Сарагскім сельсавеце звярнулася жанчына з праблемай атрымання пашпарта для сваёй 14-гадовай дачкі. Галоўны дакумент падлетку не могуць выдаць у сувязі з тым, што дом, дзе пражывае сям'я, не зарэгістраваны. У Нацыянальным кадастравым агенцтве ён не лічыцца, хаця дом належыць ААТ «Сарагі-Агра», у якім жанчына адпрацавала каля 15 гадоў. Прыватызаваць будынак нельга, бо дакументальна яго не існуе, а кіраўнік гаспадаркі не можа аказаць дапамогу. «Дзяўчынка ў наступным годзе збіраецца паступаць, але пашпарта ў яе дагэтуль няма, гісторыя кранула мяне да глыбіні душы, таму буду імкнуцца дапамагчы сям'і праз свае дэпутацкія інструменты», — тлумачыць Алена Пархімчык.

Звярталася жанчына, якая выхоўвае дзіця з цукровым дыябетам першага тыпу. Для маленькіх пацыентаў ужо з'явіліся глюкометры, якімі не трэба праколваць скуру, а трэба проста прыклеіць як налепку, праз якую бацькі будуць разумець узровень цукру ў крыві. Але такія глюкометры каштуюць дорага, і не ва ўсіх бацькоў ёсць магчымасць аблегчыць стан хворага дзіцяці такім чынам. Заяўніца папрасіла, каб для такой катэгорыі хворых падобныя глюкометры выдаваліся бясплатна. Пакуль Мінздраў не ўключыў пытанне ў распрацоўку, але яно знаходзіцца на чарзе.

Яшчэ адна жанчына звярнулася з нагоды атрымання пенсіі. Яна ў адзіночку выхоўвае дзіця з інваліднасцю, узнікла пытанне: атрымліваць пенсію па страце карміцеля або пенсію па інваліднасці. Але зарплаты жанчыны ні з той, ні з другой пенсіяй не хапае на ўтрыманне сям'і. Атрымліваць адразу дзве пенсіі нельга па заканадаўстве, аднак такія звароты сустракаюцца часта, таму будзе разгледжана пытанне аб значным павышэнні адной з дзвюх пенсій.

«Не бывае нязначных праблем. Калі людзі звяртаюцца да цябе з тым ці іншым пытаннем, значыць, для іх яно мае вельмі важны сэнс. І задача дэпутатаў — прапусціць кожны зварот праз асабістую прызму, знайсці разумнае вырашэнне пытання з дапамогай органаў кіравання. Тады людзі будуць бачыць, што кожны з нас працуе дзеля народа», — заключыла дэпутат.

Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.
Фота з архіва Алены ПАРХІМЧЫК.

Калі дакумент патрабуе дапрацоўкі

Як сустрэча з калектывам вылілася ў калектыўны зварот і што было далей

Пра работу ў сваёй акрузе карэспандэнту газеты расказаў дэпутат Палаты прадстаўнікоў па Баранавіцкай-Заходняй акрузе № 5 Аляксей РАЙКО. Гэтая работа, паводле слоў дэпутата, будуецца на пастаяннай камунікацыі з выбаршчыкамі, як ужывую, у анлайн-фармаце, так і з дапамогай месенджараў, сацсетак.

— Для мяне важна быць заўсёды ў кантакце з людзьмі, таму я выкарыстоўваю ўвесь арсенал магчымых сродкаў зваротнай сувязі, — гаворыць дэпутат. — Аднак больш за ўсё звароташ паступае падчас асабістых прыёмаў, сустрэч у працоўных калектывах, якія сталі традыцыйнымі. На сустрэчах гараджане прапаноўваюць, крытыкуюць, выказваюць заўвагі. І гэта вельмі добра. Сваёй задачай бачу не толькі паслухаць чалавека, але і знайсці рацыянальнае зерне ў кожным звароце.

Часцей за ўсё жыхары Баранавічаў уздымаюць пытанні добраўпарадкавання, работы ЖКГ, стану дарог, работы транспарту, у прыватнасці графікаў руху аўтобусаў. Вось некалькі канкрэтных прыкладаў. Падчас сустрэч у працоўных калектывах у верасні грамадзяне звярнуліся з просьбай уладкаваць тратуар па вуліцы Чыгуначнай. Названая вуліца далёка не магістральная, але ж пракладку тратуара дыктуюць не толькі неабходнасць эстэтыкі, але і найперш пытанні бяспекі. Як вядома, аўтамабіляў на нашых вуліцах з кожным годам становіцца ўсё больш, і не ўсе іх кіроўцы строга прытрымліваюцца правілаў руху вось на такіх вуліцах. Пытанне трымае на кантролі гарадская выканаўчая ўлада. Тратуар з'явіцца на ўчастку названай вуліцы разам з алеяй Памяці да 80-годдзя Вялікай Перамогі. Алею налета мае намер пасадзіць Баранавіцкае аддзяленне Беларускай чыгункі ў гонар чыгуначнікаў з пакалення пераможцаў.

На адной з сустрэч з дэпутатам Райко выбаршчыкі прапанавалі ўладкаваць пешаходны пераход побач з аўтобусным прыпынкам «Сельгастэхніка» каля дома № 124 па вуліцы Вільчкоўскага. Пытанне ўзнікла нездарма. Мамы і таты хвалююцца за дзяцей, якія ходзяць у школу № 12. Ды і іншым пешаходам, што пераходзяць вуліцу Вільчкоўскага з боку вуліцы Гастэла, «зебра» на дарозе была б дарэчы. Па дэпутацкім запыце спецыялісты гарадской Дзяржаўтаінспекцыі разам з дарожнікамі вывучаюць сітуацыю, і канчатковае рашэнне будзе прымацца на пасяджэнні гарадской камісіі па бяспецы дарожнага руху.

Дэпутат расказаў таксама, што падтрымлівае імкненне многіх бацькоў адраджаць і развіваць дзіцячыя пляцоўкі ў дварах. Бацькі лічаць, што сучасных дзяцей прывабліваюць яркія, цікавыя атракцыёны. Нягледзячы на апошнія дазволіць адцягнуць увагу хлопчыкаў і дзяўчынак ад гаджэтаў і прастымулюе больш часу праводзіць на свежым паветры. З такой праблемай звярнуліся жыхары дамоў па вуліцы Брэсцкай, дзе

Дэпутат Аляксей РАЙКО на Баранавіцкім заводзе гандлёвага машынабудавання.

ёсць традыцыйныя арэлі, горка, пясочніца. Адбылася гутарка наконт магчымага сумеснага фінансавання атракцыёнаў дзіцячай пляцоўкі, калі палову кошту аплачвае гарадскі бюджэт, а палову самі жыльцы. Людзей зацікавіла такая перспектыва. Што рабіць далей, яны ведаюць: вылучыць актывістаў, якія могуць заняцца зборам сродкаў, і рухацца паэтапна на шляху рэалізацыі ініцыятывы.

Звароты бываюць самыя розныя. Часам яны датычацца канкрэтнай праблемы, і тады даводзіцца апаратыўна звяртацца ў адпаведныя службы. Скажам, жыльцы дамоў па вуліцы Камсамольскай паскардзіліся на перабоі ў электразабеспячэнні. На дэпутацкі запыт атрыманы адказ ад арганізацыі, якая адказвае за эксплуатацыю сетак, энергетыкі абяцаюць замяніць провад на лініі электрапередачы ў снежні.

Яшчэ Аляксей Іванавіч расказаў, як сустрэча з працоўным калектывам аўтобуснага парка Баранавічаў вылілася ў зварот гэтага працоўнага калектыву. Рэч у тым, што 24 ліпеня 2024 года выйшаў загад Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю № 219 «Аб уключэнні ў Дзяржаўны рэестр суб'ектаў натуральных манаполій». Згодна з гэтым дакументам, аўтобусны парк горада Баранавічы, як і, дарэчы, Пінскі аўтобусны парк, трапілі ў названы Дзяржаўны рэестр па таварнай пазіцыі «паслугі транспартных тэрміналаў». Казус сітуацыі заключаецца ў тым, што апошняе цягне за сабой немагчымасць выканання нормаў Указа Прэзідэнта № 181 «Аб некаторых мерах па ўдасканаленні дзяржаўнага рэгулявання ў галіне аплаты працы». Карацей, неадкладжаны прававы механізм пагражаў паўплываць на памер зарплаты вадзіцеляў ў бок яе памяншэння. Зразумела, чаму калектыў выступіў з такім зваротам...

«Скажу толькі, што работа, праведзеная разам з Пастаянай камісіяй па прамысловасці, энергетыцы, транспарце, сувязі і лічбавым развіцці Палаты прадстаўнікоў дазволіла перанесці тэрмін уступлення ў сілу дакумента МАРГ для больш дэталёвай яго прапрацоўкі», — адзначае дэпутат.

— Многія нашы грамадзяне карыстаюцца паслугамі арганізацый, якія выдаюць спажывецкія крэдыты (мікразаймы). Не раз даводзілася чуць нараканні ад людзей на завышаныя працэнты па такіх крэдытах, — гаворыць Аляксей Райко. — На гэтыя тэмы выказваліся і выбаршчыкі падчас сустрэч, тым больш што цяпер у парламенце разглядаецца праект Закона «Аб спажывецкім крэдыце (мікразайме)». Мною было ініцыявана правядзенне круглага стала па названых праблемах. На прапанову адгукнуліся кіраўнікі вядучых банкаў нашага горада. Дыскусія атрымалася плённай і канструктыўнай. Прапановы, якія паступілі, я накіраваў у Нацыянальны банк як асноўны распрацоўшчык праекта.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
Фота з архіва дэпутата.

Сямейная газета
Выпуск № 18 (243)

Як ёсць

ДОЧКІ... І МАЦІ

НАЙПЕРШ: *нічога незвычайнага за гэтай сям'ёй не назіралася — людзі як людзі: маці, бацька, двое дзяцей. Не назіраецца, магчыма, і цяпер?*

Але па парадку.

Не тры, як у іншых, а ўсе чатыры вуглы ў той хаце трымала жанчына (муж — пусці-павалюся) — гатавала, прыбірала, шыла, вязала, бо трэба ж апранацца, абжывацца, гадаваць дзяцей, думаць пра людскае жыллё.

Уступіла ў ЖБК (там чарга карацейшая), без капейкі часам сядзела, але перавезла сям'ю ў новую кватэру. Не паспела толкам абжыцца, даўгі пааддаваць, — на заводзе дачны бум распачаўся. Яна таксама ўзялася штосьці будаваць і вырошчваць сваю садавіну-гародніну, рабіць закаткі... Хоць такая ды «падпорка» ў бюджэце. І прывычка — пяць дзён у тыдзень працаваць на заводзе і дома, два — на дачы.

Цяжка? Не, бо, па-першае, маладая была і «практычна здаровая», па-другое, побач і акурат таксама круціліся многія: радаваліся першаму яблыку-агурку, фарсілі ў самаробных абновах, ганарыліся дзецьмі.

У яе харошыя дочкі раслі — абедзве атрымалі прафесіі, выйшлі замуж, пасля чаго ў бацькоў (а найперш у матулі) ці не ўсё пачалося спачатку: унукі, хваробы, дзіцячыя садкі, вечныя клопаты пра грошы і людскае жыллё...

У працы і штодзённых турботах неўпрыкмет праляцелі гады, бацькі на пенсію выйшлі, але ж маці без спраў не сядзела — летась яшчэ працавала. І не толькі на лецішчы: па-ранейшаму дапамагала дочкам.

Што ж сёлета? Як і варта было чакаць, да пары збан ваду носіць: захварэлі (абое), неяк раптам знясілелі-разгубіліся... Бацька стаў кашалёк хаваць, шукаць-не знаходзіць і крычаць, што ўкралі, тэлевізар па начах глядзець (гук на ўсю моц), неяк ваду не перакрыў — затапіў кватэру знізу... Маці ўвесь час губляла ключы, акуляры, лекі, спаліла посуд — забывалася газ выключаць і ежу ў халадзільнік ставіць... Нешта сапсаванае часам елі, сварыліся, мірыліся... Ну як малыя! І старэйшая дачка, магчыма, забрала б іх... Але ў кватэры, дзе жыве, толькі два пакоі. Калі перавезці бацькоў, давядзецца самой з мужам і сынам туліцца ў адным. Да таго ж жыллё гэта мужава.

У малодшай сястры — сваё і досыць прасторнае. Але зноў жа — двое амаль дарослых дзяцей ад першага мужа, а цяпер з'явіўся другі, і жывуць яны ў так званым грамадзянскім шлюбе... Жывуць, пакуль няма старых. Калі перавезці — хто ведае, як там павернецца?

Таму — дублікаты ключоў ад бацькоўскай кватэры дочкі аддалі суседзям. Яны — хто па дабраце душэўнай, хто ў сваіх жа інтарэсах (як бы чаго не выйшла?) — цягам дня да старых зазіраюць і дочкам (добра, што мабільнікі ёсць!) час ад часу назвоньваюць...

Так — у пастаяннай трывозе, ад званка да званка, у іх абедзвюх праходзяць дні. Так, напэўна, будуць праходзіць тыдні. Пакуль...

Пакуль не здарыцца непапраўнае?..

...У знаёмай вёсцы надоечы пахаванне было: у лепшы свет бабуля сышла. У адзіноце свой век дажывала (дочкі — у недалёкім Мінску, абедзве ўладкаваныя, абедзве вольныя, бо на пенсіі ўжо). Але ў маці бывалі рэдка: старэйшая ўсё за межы ездзіла (там сын і ўнукі), а ў малодшай сабака дома. Таксама ж аднаго не кінеш...

Маці ўсё разумела і на іх не дужа разлічвала. Да яе сацыяльны работнік прыходзіў. Ён аднойчы і заспеў... Ужо без прытомнасці. Дочкі тады адразу ж прыляцелі. Трое сутак амаль неадступна сядзелі побач, трое сутак плакалі-малілі, каб маці ажыла, каб убачыла, што яны прыехалі!.. Трое сутак чакалі, што, можа, скажа ім нешта... І не дачакаліся.

На ўсе могілкі потым галаслі. Пыталіся, куды сабралася? На каго пакідае іх? Бо заўсёды ж так клапацілася! Казалі, якой яна працаўнічкай была, якой гаспадыняй, якой рукадзельніцай... Найлепшай у свеце!

Карацей, з'явілася ў іх... «нагода», каб успомніць, якой яна была мамай. І будзе ж, напэўна, час, каб падумаць, якімі яны былі дочкамі. Бо гэта лухта, няпраўда, што ўсё праходзіць. Усё застаецца — у памяці.

І з ёй потым трэба жыць.

Валянціна ДОЎНАР.

Ведай нашых!

«МЫ ІМКНУЛІСЯ ПАКАЗАЦЬ УСЁ, НА ШТО ЗДОЛЬНЫЯ»

Як ішла да перамогі на рэспубліканскім конкурсе сям'я Саўчукоў з Гродна

МЫ сустрэліся з Вольгай і Уладзімірам у гарадскім кафэ якраз паміж іх вяртаннем з Мінска і паездкай у Полацк на афіцыйную сустрэчу. Настрой у абаіх быў узнёслы. Яно і зразумела. Прадстаўнікі Гродзеншчыны ўпершыню сталі пераможцамі конкурсу «Сям'я года — 2024», які шосты раз прайшоў у Беларусі. Але наша размова закранула не толькі гэты аспект. Было цікава даведацца, як жыве шматдзетная сям'я Саўчукоў, якімі прынцыпамі карыстаецца ў выхаванні дзяцей, што лічыць важным у сямейных адносінах. І вось што ў выніку атрымалася...

Крокі да поспеху

Вольга адразу прыгадала ўсю гісторыю іх конкурснай эпапеі. Было некалькі этапаў, самы першы — раённы. Тады на ўдзел натхнілі настаўнікі 41-й школы, дзе вучацца трое дзяцей Саўчукоў. Менавіта падчас падрыхтоўкі сям'я адчула вялікую падтрымку з боку педагагічнага калектыву. Было вырашана максімальна сябе праявіць, паказаць усё, на што здольныя. І пасля таго, як атрымалі гэту першую перамогу, прыйшло адчуванне, што трэба ісці да канца.

Цікава, што Уладзімір напачатку не вельмі быў скіраваны на такі праект. Але большасць сямейнікаў агульным галасаваннем падтрымалі свой удзел у конкурснай праграме. Паступова і гаспадар сям'і ўліўся ў працэс. Быў узяты курс на перамогу. Удала выступілі на абласным этапе конкурсу ў складзе 19 сем'яў Гродзенскай вобласці. Пачалася падрыхтоўка да самага адказнага — фінальнага этапу конкурсу «Сям'я года — 2024».

(Заканчэнне на 5-й стар. «СГ».)

Інклюзіўная адукацыя

ШКОЛА ЧАЛАВЕЧНАСЦІ

У Беларусі 118 школ уключаны ў праект «Інклюзіўная адукацыя: спрыяльнае асяроддзе для рэалізацыі патэнцыялу кожнага дзіцяці»

АДРАС нашага наведвання — сталічная сярэдняя школа № 187. Там дзейнічае шэсць класаў інтэграванага навучання і выхавання, у якіх займаюцца 22 дзіцяці з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. Тры з іх адкрыты ў пачатковай школе і тры — у старэйшай. У камітэце па адукацыі Мінгарвыканкама гэту ўстанову адзначылі недарма: менавіта тут — адзін з самых паспяховых і дзейсных досведаў інтэграцыі звычайных дзяцей і дзяцей з асаблівасцямі развіцця. Педагогі здолелі стварыць такую атмасферу, каб вучням было камфортна як у сценах самой школы, так і з іх настаўнікамі, а таксама адно з адным. Дзяцей з АПФР не толькі навучаюць і выхоўваюць разам з іх аднагодкамі, але і далучаюць, па жаданні, да розных школьных мерапрыемстваў — ранішнікаў і свят, паходаў у музеі і кінатэатры. Не так даўно ў школе адкрыўся свой тэатр, і ў адну з першых пастановак у якасці акцёраў запрасілі асаблівых вучняў...

(Заканчэнне на 4-й стар. «СГ».)

Дырэктар сярэдняй школы № 187 Іна МАЗУР.

ДЗЯКУЙ, МАМА, ШТО Я ЯШЧЭ МАГУ ПАБЫЦЬ ДЗІЦЕМ!

КАСТРЫЧНІК — самы прыгожы восеньскі месяц. Менавіта ў пару залатой восені стала традыцыяй адзначаць 14 кастрычніка Дзень маці, а 21 кастрычніка — Дзень бацькі. І ўсе разам гэта называюць Тыднем бацькоўскай любові. І гэта добрая нагода распытаць дарослых людзей аб бацьках.

Максім РАСОХА:

«АТМАСФЕРА БАЦЬКОЎСКАЙ СЯМ'І — ГЭТА ЎЗАЕМАПАВАГА І ЛЮБОЎ»

Мастацкі кіраўнік — галоўны дырыжор Нацыянальнага акадэмічнага канцэртнага аркестра Беларусі імя М. Я. Фінберга Максім Расоха кажа, што яго бацькі — прыклад безумоўнай і беззапаветнай любові да сваіх дзяцей.

— Удзячны сваім бацькам за тое, што яны далі мне жыццё і дапамаглі з выбарам любімай прафесіі, — кажа Максім Мікалаевіч. — Акрамя звычайнай школы, я вучыўся і ў музычнай. Туды мяне накіравалі бацькі, але не так, што прывялі ў школу і давай, будзеш іграць на трубе. А папярэдне размаўлялі са мной, маўляў, добра будзе, калі я сам змагу сыграць мелодыю з любімага мульфільма. Мае стрыечныя браты таксама вучыліся ў музыкалцы. Гэта ўжо пазней я зразумеў, што бацькі хацелі мяне заняць, засцерагаючы ад бязмэтнага бадзяння на вуліцы. А яшчэ ў таты быў такі практычны падыход: калі сын — духавік, гэта шанц трапіць у музычны ўзвод і яму будзе лягчэй служыць у войску.

Шчыра скажу: спачатку мне не цікава было вучыцца, часам прагульваў заняткі. Педагогі, якія разгледзелі ў мяне здольнасці да музыкі, прыходзілі і паведамлялі пра гэта бацькам, балазе, школа была літаральна ў дварах нашага дома. Бацькі ніколі не сварыліся, проста тлумачылі, што музычная адукацыя не будзе лішняй у маім жыцці, кім бы я ні працаваў.

Максім Расоха з мамай Марынай Трафімаўнай і татам Мікалаем Васільевічам.

Я сур'ёзна думаў, што пайду вучыцца ў кулінарны тэхнікум. Мой тата фенаменальна гатаваў! І прабабуля — цудоўная кулінарка! Мне гэта падабалася, я і цяпер жартую, што я шэф-кухар, толькі ў музыцы.

Але потым у маёй школе стварылі духавы аркестр. І вось калі ў нас пачаліся рэпетыцыі, мне стала цікава вучыцца. А потым — канцэрты, і я зразумеў, што хачу стаць прафесійным музыкантам.

Калі вучыўся ў кансерваторыі, выязджаў на гастролі за мяжу. Як радаваліся бацькі, што ў мяне з'явілася магчымасць убачыць свет, якой не было ў іх. Яны так шчыра былі рады, што ў нашага пакалення жыццё лягчэйшае, цікавейшае.

Вельмі ўдзячны бацькам, што яны мне і брату давалі свабоду, у нас увогуле ў сям'і ніхто ні на каго ніколі не «ціснуў». Да нас з малых гадоў ставіліся як да асоб, на кожнае нашае «чаму» абавязкова быў адказ. Атмасфера бацькоўскай сям'і — гэта ўзаемапавага і любоў.

А яшчэ дзякуючы бацькам захапляюся нашай прыродай. Мы часта выбіраліся адпачываць: палатка, вогнішча, песні і шчырыя размовы.

Мяне з братам ніколі не вучылі, як сябе паводзіць. Мы проста бачылі, як жывуць нашы бацькі, як яны ставяцца да людзей. Мой тата гатовы быў усё зрабіць спачатку для іншых, потым — для сябе. І вось цяпер заўважаю гэтую ж рысу характару ў сябе. І ў такія моманты мне здаецца, што тата, які ўжо памёр, недзе побач і глядзіць на мяне з падбадзёрвальнай усмешкай.

Таццяна ПАНОВА:

«У МАІМ ДЗЯЦІНСТВЕ НЕ БЫЛО СТРАХУ ПЕРАД ДАРОСЛЫМІ»

Мастацкі кіраўнік Майстэрні эстраднага мастацтва «Хвілінка» Таццяна Панова ўмее спалучаць паспяховую кар'еру і шчаслівае сямейнае жыццё.

Таццяна Панова з мамай Раісай Міхайлаўнай.

— Маё дзяцінства... Гэта мама, дзядуля, бабуля і вельмі цікавае, насычанае жыццё, — дзеліцца Таццяна Мікалаеўна. — Дзядуля па прафесіі быў інжынер-будаўнік, а ў душы — спявак. Мама — музычны работнік. А я займалася фігурным катаннем, вучылася ў музычнай школе і спявала ў дзіцячым хоры ДК МТЗ. Хор мне падабаўся больш, чым музшкола, але мама сказала: «Калі пачала нейкую справу, даводзь яе да канца». За поспехі ў музычнай школе мяне заахвочвалі: дзядуля купляў мой любімы бісквітна-крэмавы торт, а мама дарыла мініяцюрныя лялькі. Гэта калекцыя і сёння ў нашым доме.

З дзяцінства вельмі любіла эстрадную музыку. Асабліва мне падабаліся песні з фільмаў «Прыгоды Бураціна» і «Пра Чырвоную Шапачку». Я ведала, што адзін чалавек з аператарскай групы, якая працавала ў гэтых фільмах, — мой тата. Бацькі разышліся, калі я была маленькай, але я вельмі ўдзячная маме, што яна не расказвала мне казак аб тым, што мой тата — касманаўт або капітан далёкага плавання. А тата, дарэчы, цікавіўся маім жыццём, але так атрымалася, што як бы збоку. Ён нават інкогніта прыходзіў на канцэрт «Хвілінкі»...

Мама! Яна падарыла мне ўвесь свет! Мы шмат падарожнічалі, хадзілі на канцэрты. Нашы сваякі жывуць у Санк-Пецярбургу, дык вось у мяне да гэтага часу захавалася звычайная папяровая карта Ленінграда, на якой я намалявала наш маршрут па архітэктурных славутасцях. Памятаю, паехалі на канікулах у Феадосію. Мы з мамай правялі на пляжы пяць працэнтаў нашага часу і шчыра не разумелі людзей, якія праводзілі там усе дні напралёт. А мы пабывалі ва ўсіх музеях, схадзілі на ўсе канцэрты. Можа, мы з'ядалі менш садавіны. Але садавіна і нават новыя сукенкі забудуцца, а вось уражанні, эмоцыі застаюцца назаўжды.

Мне здаецца, самае галоўнае, што ў маім дзяцінстве не было страху перад дарослымі. Мама неяк так выбудавала адносіны, што мне было соромна дрэнна вучыцца ці паводзіць сябе. З вышыні сваіх гадоў я разумею, што гэта значна цяжэй, чым проста сварыцца, караць дзіця за нейкія правіннасці. Мне заўсёды хацелася быць лепшай, каб радаваць сваіх родных!

Вельмі ўдзячная дзядулю і бабулі, што яны давалі нам свабоду. Напрыклад, кожныя выхадныя яны клікалі нас на лецішча, а мы з мамай ішлі на канцэрты, у кафэ. Дарэчы, маё любімае дзіцячае кафэ — «Вясёлка» ў парку імя Горкага, я выступала на яго адкрыцці. А лецішча... Прыходзіць час, і чалавеку хочацца зазямліцца. Мы з мужам купілі лецішча зусім нядаўна, але тады, калі нам захацелася мець свой загарадны райскі куток.

Звычайна я сама прымаю рашэнні. Вось і ў музычнае вучылішча я сама вырашыла паступаць. Дарослым мой выбар спадабаўся. Вельмі хвалявалася, бо ў мой год быў невялікі набор. Глядзець спісы тых, хто паступіў, паехала з мамай. Мы так узрадаваліся, калі ўбачылі маё прозвішча, што потым селі не ў той тралейбус.

А калі прыйшоў час па-сапраўднаму вызначацца, чым займацца, то мама і яе сяброўкі раілі ісці працаваць у музычную школу, а яшчэ быў варыянт аспірантуры. Вядома, гэта камфортная, нармаваная праца, тым больш што я выйшла замуж яшчэ студэнткай інстытута культуры. Але мне хацелася большага! Так у маім жыцці з'явіўся свой дзіцячы эстрадны калектыў. Усё гэта магчыма толькі пры падтрымцы сям'і. Мая мама цудоўна ладзіць з зяцем, і калі я з'язджала з «Хвілінкай» на конкурсы, мама і муж заставаліся з сынам.

Вельмі шчаслівая, што цяпер мая мама працуе ў «Хвілінцы», яна вядзе малодшую групу па аўтарскай методыцы. Гэта так цудоўна, калі мама яшчэ і калега. У нас вельмі цёплыя адносіны, я вельмі люблю сваю маму!

Сяргей ШАЛІМА:

«З МАІМІ БАЦЬКАМІ ЗАЎСЁДЫ БЫЛО ЦІКАВА»

Для Сяргея Шалімы, юрысконсульта Беларускай дзяржаўнай харэаграфічнай гімназіі-каледжа, яго бацькі — эталон у жыцці і творчасці, ва ўзаемаадносінах з роднымі, сябрамі і калегамі.

— Мой бацька, Мікалай Пятровіч, — унікальны чалавек, прайшоў шлях ад радавога следчага, пракурора Ленінскага раёна Мінска да старшыні Рэспубліканскай калегіі адвакатаў, — расказвае Сяргей Мікалаевіч. — Ён працягваў практыкаваць да глыбокай пенсіі, і мне пашанцавала, што ў асобе таты ў мяне быў настаўнік і партнёр у прафесіі, калі я працаваў адвакатам.

Тата — прадстаўнік самай вялікай партызанскай сям'і ў Беларусі. Некалькі пакаленняў сям'і Шаліма змагаліся ў самай сакрэтнай партызанскай брыгадзе «Дзядзька Коля». Тата і сам дзіцем быў з бацькамі ў партызанах. На адной з традыцыйных сустрэч на беразе возера Палік ён паабяцаў, што напіша кнігу пра брыгаду. Я яму дапамагаў у гэтай справе, мы сабралі і сістэматызавалі шмат звестак. Выдавалі

Мікалай Шаліма і Таццяна Пятрова.

кнігу за свой кошт, і я рады, што ўсё гэта адбылося яшчэ пры жыцці таты. Яго няма ўжо тры гады, але не бывае і дня, каб я пра яго не ўспомніў і не падумаў, як жа мне яго не хапае.

Маю маму, Таццяну Іонаўну Пятрову, і сёння пазнаюць па голасе тыя, хто ў часы праваднога радыё слухаў праграмы «Рамантыкі», «Прэзумпцыя», «Прытайкі» і «Чатыры з хвосцікам».

Мама вяла клуб «Рэпарцёр», з якога выраслі Таццяна Рудакоўская, Ягор Хрусталёў, Тамара Лісіцкая, Аляксандр Хабараў і іншыя зоркі журналістыкі. Заняткі гэтага клуба праходзілі ў нас дома.

У час канікул любіў ездзіць з мамай у камандзіроўкі, яна брала мяне ў такія месцы, дзе ёсць славутасці. Мы шмат падарожнічалі і пачыналі з Беларусі. З маімі бацькамі заўсёды было цікава і цёпла.

Маральна-прававы канал для дзяцей і падлеткаў «Прэзумпцыя» мама вяла ў прамым эфіры. Гэтая работа мела на ўвазе ўдзел у лёсах няшчасных дзяцей. І мама дагэтуль упэўнена, што перавыхаваць чалавека можна толькі дабрынёй. Часам ёй удавалася выцягнуць са дна жыцця падлеткаў.

Пры вялікай занятасці бацькоў, а здаралася, што мяне з садка забіралі суседзі, не магу сказаць, што быў абдзелены іх ўвагай. Больш за тое, у мяне была магчымасць вырасці такім цяплічным дзіцем, але бацькі гэтага не дапусцілі. Так, я ведаў, што ёсць дзеці, якім жылося вельмі цяжка. Увогуле, у мяне было цікавае дзяцінства.

Мама мяне здзіўляе і захапляе. Уявіце, пасля 60 гадоў яна пачала браць урокі ігры на гітары і ладзіла хатнія канцэрты для сяброў! А якая яна цудоўная бабуля для маёй дачкі!

Маёй маме без малога 85 гадоў, у яе вялікі спіс хвароб, але як яна трымаецца! На лецішчы ёсць пару градак, дык ёй трэба абавязкова іх прапалоць, няхай павольна, на ўслончыку, але самой. А яшчэ яна ніколі не выйдзе за парог кватэры без прычоскі і макіяжу.

Чым старэйшымі мы становімся, тым лепш разумеем многія рэчы. У 25 гадоў я здаваўся сабе такім дарослым і дзівіўся мамінай фразе аб тым, што ў любым узросце мы — дзеці, пакуль жывыя нашы бацькі. Цяпер я гэта разумею і адчуваю. Ведаю, што любоў бывае рознай. Адна — да бацькоў, іншая — да сваіх дзяцей. Дзякуй, мама, што я яшчэ магу пабыць дзіцем!

Маргарыта ДРАЗДОВА.

ДЗЕЛЯ АЦАЛЕННЯ ДУШЫ І ЦЕЛА

Чаму таінства прычасця ў хрысціянскай літаратуры называюць «лекамі ад усіх хвароб»

Як вядома, у Праваслаўнай царкве існуе сем таінстваў, кожнае з якіх мае глыбокі духоўны змест. Але ёсць сярод іх адно, якое самі святары называюць асновай хрысціянскага светаўспрымання і «цэнтрам хрысціянства». Размова ідзе аб таінстве прычасця, або еўхарыстыі. Пра глыбінны сэнс, які нясе ў сабе прычасце, расказвае настаяцель прыхода храма святіцеля Спірыдона Трыміфунцкага, святар Аляксандр ПАЛЬЧЭЎСКІ.

— Айцец Аляксандр, у чым сэнс таінства прычасця? Што яно дае чалавеку? У назве таінства чуецца слова «частка» — то-бок, гэта магчымасць «стаць часткай чагосьці». Чаго менавіта?

— Прычасце — гэта таінства таінстваў, сэрца царкоўнага жыцця, як кажуць айцы Царквы. Гэта не проста адно з сямі таінстваў, якія мы ведаем у Царкве. Гэта галоўнае, асноўнае таінства. І сапраўды, нават сама яго назва гаворыць аб нашай датычнасці да Творцы, далучнасці да Яго бажэственнай благадаці. Гасподзь даў чалавеку сродак, праз які ён можа ўступаць з Ім у глыбокія зносіны і дасягаць яднання.

Хлеб і віно

— Прычасце ўзыходзіць да евангельскай гісторыі пра Тайную Вячэру. Раскажыце, калі ласка, пра паходжанне гэтага таінства.

— Паводле хрысціянскага вучэння, Бог сам заснаваў гэтае таінства. У Евангеллі сказана, што ўпершыню прычасце здзейсніў Ісус Хрыстос падчас Тайнай Вячэры, калі пад выглядам хлеба і віна падаў сваім вучням, апосталам, сваё Бажэственнае Цела і сваю Кроў. А таксама загадаў ім здзяйсняць і далей гэтае таінства ў Яго ўспамін. З таго моманту на працягу ўсёй гісторыі хрысціянскай Царквы гэта таінства здзяйсняецца ва ўсіх храмах як найважнейшая частка бажэственнай літургіі. Падчас гэтага таінства мы выкарыстоўваем хлеб і чырвонае віно, якія пры малітве святара і ўсіх, хто знаходзіцца ў храме, і закліканні Святога Духа ператаюць быць хлебам і віном. У духоўным сэнсе гэтыя матэрыяльныя элементы ўяўляюць сабой ужо зусім іншую субстанцыю — і гэта важны багаслоўскі момант. Таінства прычасця — не проста ўспамін пра Тайную Вячэру, якую ўчыніў Гасподзь, не проста сімвалы, вобразы, параўнанні і метафары. Калі мы спажываем хлеб і віно падчас еўхарыстыі, мы сапраўды прымаем у сябе часцінку Цела і Крыві Хрыста. Чалавек двухскладовы — гэта і матэрыя, і ў той жа час дух, несмяротная душа. Таксама двухскладовае і абсалютна любое таінства. Яно мае матэрыяльны аспект, але ёсць і духоўнае вымярэнне — і яно важнейшае. Паслядоўнасць слоў і дзеянняў неабходны чалавеку, таму што наш свет матэрыяльны. Праз пэўныя дзеянні на духоўным узроўні падчас Тайнай Вячэры Збавіцель аднавіў страчаную сувязь чалавека з Богам. І сёння прычасце па-ранейшаму, як і больш за дзве тысячы гадоў таму, застаецца сродкам, праз які мы маем магчымасць уступаць у зносіны, яднанне з Богам.

«У практыцы Праваслаўнай царквы таінства прычасця злучаецца з таінствам споведзі. Больш за тое, любое таінства ў канчатковым выніку падводзіць нас да таінства прычасця».

— Давайце спынімся на вонкавым баку таінства прычасця. У агульных рысах гэта вядома кожнаму, але, магчыма, ёсць нейкія нюансы, на якія важна звярнуць увагу?

— Таінства прычасця, як я ўжо казаў, здзяйсняецца падчас бажэственнай літургіі: паслядоўнасць свяшчэнных дзеянняў, малітваў, якія прамаўляе святар, і спеваў, якія пяе хор, сфарміравалася на працягу многіх стагоддзяў. Богаслужэнне працягваецца паўтары-дзве гадзіны, літургія складаецца з тэкстаў, якія спачатку рыхтуюць чалавека да прычашчэння, затым надыходзіць час асвячэння Святых Дароў — хлеба і віна. Пасля адбываецца прычашчэнне святароў (яны прычашчаюцца ў алтары), а потым — усіх вернікаў. У практыцы Праваслаўнай царквы таінства прычасця злучаецца з таінствам споведзі. Больш за тое, любое таінства ў канчатковым выніку падводзіць нас да таінства прычасця. Калі здзяйсняецца таінства вянчання, яно злучаецца з прычасцем, таінства хрышчэння, калі ёсць такая магчымасць, таксама злучаецца з таінствам прычасця.

Прамы шлях да Бога

— Прычашчаюць чалавека і ў выпадку цяжкай хваробы. Таінства прычасця ў хрысціянскай літаратуры называюць «сапраўднай ежай» і «лекамі ад усіх хвароб». Як гэта трэба разумець?

— Сапраўды, таінства прычасця — сродак, здольны вылечыць нашу душу, а нярэдка — і наша цела. Існуе практыка здзяйснення таінства прычасця дома, калі чалавек з-за хваробы не можа прыйсці ў храм. Святар можа таксама па папярэднім узгадненні прыехаць у бальніцу, рэанімацыю і правесці таінства прычасця там. Часам у святароў пытаюцца, ці ёсць рэальныя прыклады, калі ход хваробы «пераломваўся» менавіта пасля прынясення прычасця і людзі паступова пачыналі ісці да выздараўлення. Такіх прыкладаў дастаткова шмат. Сёння ніхто не стане адмаўляць: псіхалагічны стан чалавека напрамую звязаны з яго імунітэтам, здольнасцю арганізма змагацца з хваробай. Кожны вернік, які рэгулярна прымае прычасце, а таксама людзі, якія ўпершыню адкрылі для сябе гэтае таінства, могуць пацвердзіць: змены адбываюцца нават у іх вонкавым абліччы. Калі ў душы адчуваюцца радасць, цішыня, спакой, чалавек і выглядае інакш, і, безумоўна, становіцца мацнейшым унутрана. Але абавязковая ўмова для таго, каб гэтага дасягнуць, — усвядомлены ўдзел у гэтым таінстве, разуменне яго сэнсу і зместу. Неабходна вера ў Бога, які дзейнічае праз прычасце на душу і цела чалавека. Калі таінства ўспрымаецца павярхоўна, абстрактна, чалавек не атрымае карысці. Да любога таінства неабходна падрыхтоўка, і прычасце — не выключэнне. Нельга проста прачнуцца раніцай, выпіць кавы і пайсці прычашчацца. Важна ўнутрана падрыхтавацца да таінства, каб адпавядаць духоўнай вышыні гэтага свяшчэннага дзеяння.

— А як падрыхтавацца да прыняцця прычасця?

— Ёсць такое паняцце — гавенне. Гэта выдзелены са звычайнага жыцця перыяд часу, калі той, хто рыхтуецца да прычасця, імкнецца менш адцягвацца на мітусню. За некалькі дзён да здзяйснення абраду чалавек чытае пэўныя малітвы, у прыватнасці «Паследаванне да святога прычашчэння». Гэта малітва здольная настроіць на патрэбную «хвалю», прывесці розум і сэрца ў правільны стан. Падрыхтоўка ўключае духоўную працу, якая настройвае на ўнутраную засяроджанасць. Рыхтуючыся да прычасця, людзі імкнуцца пасціцца. Падрыхтоўкай з'яўляецца і ўдзел у богаслужэннях. Прайшоўшы ўсе гэтыя этапы, чалавек атрымае ад таінства прычасця максімальную карысць.

— Як часта трэба прыходзіць да прычасця?

— Гэта кожны вызначае для сябе сам — выпрацоўвае ўласны рытм удзелу і ў богаслужэннях, і ў таінствах. Не магу сказаць, што кожнаму верніку варта прычашчацца кожны тыдзень. Добра, калі ў чалавека ёсць духоўнік — дасведчаны святар, які можа накіраваць, падказаць нейкія нюансы, індывідуальна падабраць патрэбны «рытм». Але адназначна ўдзел у гэтым таінстве павінен быць рэгулярным. Без гэтай духоўнай падтрымкі губляецца сувязь з Богам, а менавіта гэта сувязь з'яўляецца галоўнай мэтай хрысціянскай рэлігіі. Больш за тое, само слова «рэлігія» перакладаецца з латыні як «сувязь». Мэтай хрысціянства, паўтаруся, з'яўляецца сам Бог і наша сувязь з Богам. Таінства Прычасця, як і іншыя таінствы, з'яўляецца сродкам, пры дапамозе якіх мы захоўваем і падтрымліваем гэту сувязь з Госпадам. Калі чалавек кажа: «Бог у мяне ў душы і мне не патрэбныя пасрэднікі», ён ускладняе сваю дарогу да Бога. Таму што сам Гасподзь даў людзям гэту прамую дарогу да Сябе — Царкву і царкоўныя таінствы. Гэта самы просты і непасрэдны шлях да Бога.

«У Евангеллі сказана, што ўпершыню прычасце здзейсніў Ісус Хрыстос падчас Тайнай Вячэры, калі пад выглядам хлеба і віна падаў сваім вучням, апосталам, сваё Бажэственнае Цела і сваю Кроў».

— Але як зразумець, што прычасце неабходна менавіта цяпер? Калі адчуваеш цяжар у душы, назапашаную стомленасць?

— Можна сказаць і так. Слова, учынак, нават думка, аб якіх мы шкадуем, здольныя ўнесці разлад у нашу душу. І тады мы шукаем магчымасць аднавіць страчаны баланс, вярнуць гармонію. У хрысціянстве мы маем запаведзі аб любові да Бога і любові да бліжняга — на іх грунтуецца ўсё хрысціянскае вучэнне, уся хрысціянская маральнасць. І каб заставацца здольным гэтыя запаведзі выконваць, чалавек павінен сябе духоўна падтрымліваць, падсілкоўваць. Гэту бажэственную благадаць, гэту пазітыўную энергію мы атрымліваем менавіта праз таінствы. Чалавек, які не ўдзельнічае ў таінствах, застаецца па-за межамі Царквы, па-за вымярэннем духоўнага вопыту зносін з Богам. А пры рэгулярным удзеле ў таінствах — і найперш у таінстве прычасця — гэта сувязь захоўваецца і падтрымліваецца.

У тэму

Нашы зямныя заступнікі

Дзень маці ў Беларусі прымеркаваны да свята Пакрову Прасвятой Багародзіцы

СЯМ'Я дорыць нам любоў і падтрымку, фарміруе нашу асобу і каштоўнасці, становіцца фундаментам асабістага дабрабыту і шчасця чалавека. Моцныя і паспяховыя сем'і — адна з ключавых умоў гарманічнага развіцця грамадства. Вось ужо некалькі гадоў у сярэдзіне кастрычніка ў Беларусі адзначаецца бацькоўскі тыдзень.

Праходзіць ён з 14 да 21 кастрычніка. А пачынаецца з Дня маці, які ў нашай краіне быў заснаваны ў 1996 годзе і прымеркаваны да свята Пакрову Прасвятой Багародзіцы, аднаго з самых любімых праваслаўнымі хрысціянамі. Свята прысвечана надзеі на боскае заступніцтва і зямны дабрабыт, за стагоддзі яно стала знакам нябеснай дапамогі ў небяспецы, бо Маці Божая ліцыцца заступніцай вернікаў ад жыццёвых нягод.

Глыбока паважлівае стаўленне да жанчыны-маці — адна са спрадвечных традыцый беларускага народа, і, як бы ні мянялася жыццё, у кожнага дарослага чалавека самыя цёплыя ўспаміны дзяцінства звязаны менавіта з вобразам мамы. Пра тое, наколькі важна кожнаму дзіцяці адчуваць матчыны любоў і клопат, сказана нямала. Але і ролю бацькі ў фарміраванні асобы чалавека складана пераацаніць. Без увагі і любові, падараных нам татам, наўрад ці магчыма шчаслівае дзяцінства, як і ў цэлым гарманічнае развіццё чалавека, гавораць псіхолагі. І з 2022 года ў нашай краіне заснавана новае сямейнае свята — Дзень бацькі. Яго мы святкуем 21 кастрычніка, а заклікана яно падкрэсліць асаблівую значнасць мужчыны ў выхаванні дзяцей, бо асабісты прыклад, клопат і падтрымка таты — гэта ўпэўненасць юнага чалавека ў тым, што ў яго ёсць апора, гэта вера дзіцяці ў свае сілы, у бяспеку і добразычлівасць навакольнага свету.

Дзень бацькі — свята маладое, ды і само паняцце «бацькоўскі тыдзень» з'явілася ў нашай краіне адносна нядаўна. І ўсё ж і вакол самога свята, і вакол бацькоўскага тыдня ўжо склаліся традыцыі. Гэта самыя розныя мерапрыемствы: ад сямейных конкурсаў, спаборніцтваў і канцэртаў да дабрачынных акцый і прамых тэлефонных ліній з прадстаўнікамі сферы адукацыі і аховы здароўя. А самая галоўная традыцыя, якая павінна стаць асновай бацькоўскага тыдня, — абавязковыя зносіны з пажылымі мамай і татам, нагода і магчымасць яшчэ раз сказаць ім пра свае да іх пачуцці. Яны аддавалі нам свой клопат і сваю любоў, калі мы былі маленькімі. Цяпер яны маюць патрэбу ў нас, і прыйшоў наш час аддзячыць ім увагай і цеплынёй сваёй душы.

Матэрыялы падрыхтавала Дзіяна РОНІНА.

ШКОЛА ЧАЛАВЕЧНАСЦІ

НЕ ПРЫСУД І НАВАТ НЕ ДЫЯГНАЗ

У адным з навучальных класаў мы сустракаемся з трыма мамамі асаблівых вучняў — Анастасіяй МАСЛОВАЙ, Наталляй ХІЛЕР і Таццянай БАЯРОЎСКАЙ.

У Анастасіі Ігараўны ў 187-й вучацца абодва яе сыны, Мікіта і Уладзімір. Перш чым пачаць аповед пра сваіх дзяцей, наша суразмоўніца падкрэсліла, што многія памыляюцца, лічачы расстройства аўтыстычнага спектра хваробай.

— Аўтызм — гэта не хвароба, таму што РАС, у адрозненне ад іншых захворванняў, не паддаецца лячэнню, — аргументуе яна. — Таму правільна будзе назваць гэта асаблівасцю развіцця дзіцяці.

У старэйшага сына Масловай, Мікіты, высокафункцыянальны аўтызм — сіндром Аспергера, пры якім ідзе парушэнне эмпатыі і сацыялізацыі. Больш гэта ні ў чым не праяўляецца. У такіх дзяцей высокі інтэлект, але абмежаванае кола зносін.

— Першыя чатыры класы ён наогул ні з кім не меў зносін, — расказвае мама хлопчыка. — Цяпер гэта ўсё засталося ў мінулым. Ён такі ж, як і яго звычайныя аднагодкі, і цяпер у Мікіты з'явіліся сябры.

Аднак, як аказалася, хлопец — не зусім звычайны вучань, дакладней, зусім не звычайны. У размову ўступае **намеснік дырэктара школы па вучэбнай рабоце Жанна СЛАЎНІКАВА.**

— Гэта вельмі адоранае дзіця, наша «зорка», — распавядае яна. — Хлопчык штогод удзельнічае ў гарадскім фестывалі праектных і даследчых работ «Пазнанне і творчасць». У восемь гадоў ён самастойна стварыў чат-бот (памочнік на мове Python) па інтэрнэт-бяспецы і за гэта быў удастоены Гран-пры конкурсу. Цяпер Мікіта

У педагогаў школы і бацькоў асаблівых дзяцей шмат тэм для агульнага абмеркавання.

Малому дапамаглі выпрацаваць адпаведныя паводзіны, ён ведаў, што ёсць урок, што ён доўжыцца 45 хвілін і ўвесь гэты час трэба ўдзяляць увагу толькі вучобе, ніякіх старонніх спраў.

Валодзя сур'ёзна захапляецца маляваннем. Як кажа Анастасія Маслова, ужо ёсць і поспехі. Напрыклад, у школе прайшла персанальная выстава яго работ.

— Спачатку было вельмі складана, — расказвае жанчына. — Адбіліся праблемы з канцэнтрацыяй увагі і зносінамі.

Але разам: бацькі — дома, выхавальнікі і настаўнікі — у школе — літаральна стварылі цуд, і сёння хлопчык не проста малюе, а засвойвае новыя, больш складаныя прыёмы гэтага мастацтва.

Дарэчы, маці хлопчыкаў у школе — часты госць. І справа не ў тым, што яна спрабуе неяк кантраляваць працэс навучання сваіх дзяцей.

Калі бацькі падаюць заяву ў 1 клас, іх перш за ўсё папярэджваюць аб тым, што ў школе ёсць класы інтэграванага навучання і выхавання. Калі бачаць, што дадзены факт для бацькоў непрымальны, прапаноўваюць пашукаць іншую навучальную ўстанову. З тымі, хто інфармацыю прыняў спакойна і прывёў сваіх дзяцей у школу, работа працягваецца. У чым яна заключаецца? У тлумачэнні таго, што з дзецьмі з АПФР і РАС можна вучыцца, мець зносіны і сябраваць. Што ўсе дзеці таленавітыя і ў будучыні могуць стаць буйнымі вучонымі, знакамітымі мастакамі ці проста добрымі майстрамі.

Таварыскі і дапытлівы Кірыл імкнецца ведаць як мага больш.

паралельна навучаецца ў Міжнароднай школе праграмавання «Алгарытміка».

Жанна Вячаславаўна ўпэўнена, што хлопца чакае добрая будучыня.

Малодшы сын Анастасіі Масловай, Валодзя, мае інваліднасць і навучаецца ў той жа школе, у інтэграваным класе.

— У яго затрымка развіцця, дрэнна развітае маўленне, і ён вучыцца па спецыяльнай праграме, — гаворыць жанчына. — Да школы рыхтаваліся ў спецыялізаваным дзіцячым садку і сюды прыйшлі падрыхтаваныя да навучальнага працэсу.

— Настаўнікі, выхавальнікі — мае галоўныя на дадзеным этапе памочнікі і дарадцы. Нам вельмі з імі пашанцавала. Мяне заўсёды з разуменнем выслухоўвае адміністрацыя школы. Я ведаю, што магу звярнуцца па дапамогу, абмеркаваць з настаўнікамі і выхавацелямі пытанні, якія мяне хвалююць ці трывожаць.

І прыводзіць прыклад. Аказваецца, Валодзя пачаў спрабаваць сябе ў кулінарыі ў дзіцячым садку, калі яму было чатыры гады! Сам варыў кашы, гатаваў нескладаныя стравы. Кухарскі талент развівалі дома. А калі адвучыліся год у школе, выхавальніца Валодзі звярнулася да дырэктара ўстановы адукацыі Іны Мазур з просьбай дазволіць хлопчыку гатаваць не толькі дома, але і, як кажуць, на людзях, каб генералізаваць навыкі. Іна Мікалаеўна пайшла насустрач, і юны кухар стаў гатаваць у спецыяльна абсталяванай кухні, цешачы сябе і навакольных смачнымі стравамі. Хлопчык да гэтага часу шчаслівы, што цэлы клас прадэгуставаў і захапіўся яго блінкамі. Сваімі ўменнямі і рэцэптамі простых у прыгатаванні страў Валодзя дзяліўся ўсё лета, праводзячы майстар-класы ў Telegram-канале СШ № 187 у рубрыцы «Гатоўка з Воўкам».

ВЫХАВАННЕ ТАЛЕРАНТНАСЦІ Ў ДАРОСЛЫХ І ДЗЯЦЕЙ

Дарога да ведаў Міраслава была далёка не простай. Яго маці, Наталля Вячаславаўна ХІЛЕР, са слязьмі расказвае пра няўдалы вопыт вучобы ў інтэграваным класе іншай школы.

— Выйсце трэба было шукаць тэрмінова, — працягвае яна. — Па тэлевізары выпадкова трапілася інтэрв'ю з Анастасіяй Масловай, дзе яна распавядала аб тым, як вучацца яе дзеці ў 187-й школе. Не разважаючы, накіравалася да дырэктара гэтай установы адукацыі Іны Мікалаеўны Мазур. Перажывала, вядома, каб сына прынялі. І нас прынялі! Новы навучальны год маё дзіця пачало ў гэтай школе.

Міраслаў тут ужо адаптаваўся. І знайшоў сабе сябра — Мікіту. Кажуць, два юныя геніі сёння — не разлей вада.

Жанна Слаўнікава цешыцца:

— У нас з'явілася яшчэ адна «зорка», яшчэ адзін таленавіты вучань.

У хлопца, гэтак жа, як і ў Мікіты, сіндром Аспергера. Ён вельмі разумны і сур'ёзна займаецца гісторыяй, камп'ютарным макетаваннем і праграмаваннем.

Таццяна Баяроўская закранула такую балючую для ўсіх бацькоў тэму, як прыняцце грамадствам асаблівых дзяцей і дзяцей-інвалідаў. Яна нарадзіла двайнят, двух хлопчыкаў, Данііла і Кірыла, вагой у 800 грамаў кожны. Дзяцей выхадзілі, але потым пачаліся сур'ёзныя праблемы са здароўем. У выніку Кірыл сёння навучаецца ў інтэграваным класе, Данііл — у цэнтры карэкцыйна-развіццёвага навучання і рэабілітацыі — хлопчык мае патрэбу ў пастаянным паўнацэнным доглядзе.

Тры жанчыны, тры лёсы, і ва ўсіх траіх адна мэта — забяспечыць сваім дзецям дастойнае месца ў грамадстве. Для гэтага яны прайшлі і працягваюць праходзіць калі не праз усе, дык праз вельмі шмат выпрабаванняў. Але самым цяжкім застаецца выпрабаванне чалавечай чэрствасцю, абыякавасцю, хамствам.

З гэтай жа праблемай — адсутнасцю разумення з боку некаторых бацькоў — сутыкаецца і адміністрацыя школы. Не ўсе гатовы да таго, што іх нашчадкі будуць вучыцца ў класе з асаблівымі дзецьмі.

Кіраўнік установы адукацыі распавяла, што, калі бацькі падаюць заяву ў 1 клас, іх перш за ўсё папярэджваюць аб тым, што ў школе ёсць класы інтэграванага навучання і выхавання. Калі бачаць, што дадзены факт для бацькоў непрымальны, прапаноўваюць пашукаць іншую навучальную ўстанову. З тымі, хто інфармацыю прыняў спакойна і прывёў сваіх дзяцей у школу, работа працягваецца. У чым яна заключаецца? У тлумачэнні таго, што з дзецьмі з АПФР і РАС можна вучыцца, мець зносіны і сябраваць. Што ўсе дзеці таленавітыя і ў будучыні могуць стаць буйнымі вучонымі, знакамітымі мастакамі ці проста добрымі майстрамі.

ВЕРЫМ У СВАІХ ДЗЯЦЕЙ

Даць навучэнцам неабходныя веды, дабіцца добрых вынікаў — мэта любой агульнаадукацыйнай школы. Але не самамэта для ўстановы адукацыі, дзе навучаюцца дзеці з АПФР.

Як мы казалі вышэй, ёсць у школе навучэнцы з захаваным інтэлектам і, такім чынам, з добрай паспяховасцю, ёсць і тыя, хто вучыцца па дапаможнай праграме. І ў гэтым выпадку важныя не адзнакі за іх веды, а тое, як праходзіць працэс іх адаптацыі да школьных правіл, паводзін і ўменне вырашаць простыя жыццёвыя задачы — знайсці свой клас, самастойна прыйсці ў сталовую, скласці прылады на сваю парту. У школе створана адаптыўнае адукацыйнае асяроддзе: спецыяльна абсталяваныя кабінеты, рэсурсныя класы. Сам клас падзелены на дзве зоны, адна з якіх прызначана для вучобы, у другой дзіця адпачывае і супакойваецца.

У адным з такіх памяшканняў да ўрока рыхтуецца **Інеса ЗАГАЛАВЕЦ, настаўнік-дэфектолаг.**

— У класе, дзе я працую, пяць дзяцей, трое з іх з расстройствам аўтыстычнага спектра. Яны займаюцца па праграме спецыяльнай адукацыі для дзяцей з цяжкасцямі ў навучанні. У мяне яны наведваюць заняткі па рускай і беларускай мове і літаратуры, матэматыцы, прадмеце «Чалавек і свет», карэкцыйныя заняткі. А вось працоўнае навучанне, выяўленчае мастацтва, музыку і фізічную культуру яны вывучаюць у агульным класе.

У Інесы Міхайлаўны велізарны досвед работы ў спецыялізаваных установах адукацыі, дзе выхоўваюцца дзеці з асаблівасцямі развіцця, і ў яе, вядома, ужо склалася бачанне агульнага адукацыйнага працэсу для іх.

— І ў спецыяльных установах адукацыі, і ў сярэдніх школах рэалізоўваецца адзін прынцып, да якога мы ідзём, — прынцып інклюзіі, — дзеліцца настаўнік. — Спецыяльныя дзіцячыя сады дапамагаюць выхаванцам перайсці на наступную прыступку адукацыі і развіцця і адаптавацца ў школе. Формы такой прафесійнай дапамогі выбіраюцца розныя, у тым ліку і сумесныя мерапрыемствы школы і садка.

Дзякуючы гэтай дапамозе дзеці прыходзяць у школу ўжо са сфарміраванымі навыкамі. Вялікую работу з навучэнцамі з РАС праводзяць і выхавальнікі персанальнага суправаджэння, якія сочаць за сваімі падапечнымі, бачаць, якія навыкі трэба ў іх фарміраваць.

Пакуль мы гутарылі з Інесай Міхайлаўнай, у клас са сваімі школьнымі прыладамі заходзілі дзеткі, пакідалі іх на партах і перамяшчаліся ў гульнявую, пакуль да пачатку ўрока заставаўся час. Перапыніўшы размову, настаўніца звярнула маю ўвагу на парты, дзе роўнымі стосікамі ляжалі сшыткі, падручнікі, ручкі.

— Паглядзіце, ніхто з дзяцей не памыліўся партай, кожны склаў прылады менавіта на сваю.

У голасе Інесы Загалавец гучаў гонар. І я зразумела: у гэтай школе не дзеляць перамогі на вялікія і малыя. Тут і Гран-пры прэстыжнага конкурсу, і набыццё дзіцем чаргавага жыццёвага навыку сустракаюць з аднолькавым захапленнем і радасцю. Тут вераць у сваіх асаблівых вучняў, усяляюць гэтую веру ў бацькоў і разам даюць дзецям новыя магчымасці для далейшага жыцця.

Алена ВІНАГРАДАВА.
Фота Лізаветы ГОЛАД.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

«МЫ ІМКНУЛІСЯ ПАКАЗАЦЬ УСЁ, НА ШТО ЗДОЛЬНЫЯ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

Рыхтаваліся вельмі ўпарта. Увесь верасень хадзілі на рэпетыцыі. Праграму перарабілялі, з'явіліся новыя элементы. Дапамагаў Гродзенскі каледж мастацтваў, педагогі-харэографы, рэжысёрская група, абласное ўпраўленне па працы, занятасці і сацыяльным абслугоўванні насельніцтва. Такім чынам, абласны праект атрымаў новае гучанне. Вольга прызнаецца, што вельмі хацелася выступіць удала, каб прынесці перамогу свайму Гродзенскаму рэгіёну, бо ні разу яшчэ гродзенцы на гэтым конкурсе не лідзіравалі. Гэта свайго роду ўдзячнасць усім тым, хто працаваў над сямейным праектам. Разам з тым конкурс прынёс шмат эмоцый самім удзельнікам. Суразмоўцы адзначылі, што з усімі сем'ямі фінальнага конкурсу склаліся вельмі добразычлівыя адносіны. Разам праводзілі вольны час і нават адсвяткавалі дні нараджэнняў двух дзяцей, у тым ліку і сына Вольгі і Уладзіміра.

Вольга і раней цікавілася гісторыяй свайго роду, але падчас падрыхтоўкі да конкурсу «Радавод» даведалася аб продках шмат новага.

Ад радаводу да сацыяльнага праекта

Конкурс не толькі прынёс перамогу шматдзетнай сям'і, але і дадаў звестак аб іх продках. І хоць Вольга і раней цікавілася гісторыяй свайго роду, але падчас падрыхтоўкі да конкурсу «Радавод» даведалася аб продках шмат новага. Кажа, што заўсёды марыла сістэматызаваць усе даныя ў асобным выданні, але пастаянна адкладвала з-за недахопу часу. І толькі дзякуючы конкурсу ўдалося гэта зрабіць.

«Калі нарадзіліся дзеці, мы імкнуліся стварыць такую атмасферу, каб яны бачылі ў сям'і ўзаемадапамогу і спрыяльны мікраклімат».

— Мы дакладна ўсё шукалі, капалі глыбока, муж даведаўся, што яго прадзед ваяваў у Вялікую Айчынную вайну, абараняў Маскву, бабуля дапамагала партызанам, якія вялі актыўныя баявыя дзеянні. Гэтых дэталяў мы не ведалі. Такім чынам, былі напісаны новыя старонкі ў радаводзе нашай сям'і, якімі, дарэчы, цікавяцца і нашы дзеці, — паведаміла падчас гутаркі Вольга.

Расказалі суразмоўцы і пра сямейныя традыцыі, якія бяруць пачатак з далёкага мінулага. А захоўваюць іх вясковыя бабулі, якія збіраюць сваіх нашчадкаў на калядныя і пасхальныя святы, гатуюць адпаведныя стравы. Не застаецца ў баку ад падрыхтоўкі і маладое пакаленне. Для ўсіх заўсёды знаходзіцца справа, што робіць свята яшчэ больш вясёлым і цёплым.

— Мы яшчэ толькі вучымся ўсім абрадам, але імкнёмся захаваць гэты духоўны пачатак, каб і нашы дзеці таксама далучаліся да тых традыцый, якія складваліся гадамі і дазваляюць сабрацца ўсім у бацькоўскім доме, — працягвае Вольга сваю радавую гісторыю.

Агульнай справай можна назваць і талаку для капання бульбы, калі з'язджаецца ўся радня. Дзяцей таксама імкнуцца прывучаць да працы на зямлі. І гэта дае свой плён — яны з нецярпеннем чакаюць новы бульбяны сезон, каб далучыцца да такога старажытнага квэсту.

Што датычыцца новых сямейных традыцый, яны таксама ёсць. Саўчукі вельмі любяць выязджаць з палаткамі на прыроду. Пры гэтым адключаюцца ўсе тэлефоны, працуе толькі відэакамера, з дапамогай якой потым можна прыгадаць самыя яркія моманты. Паход доўжыцца некалькі дзён і ўключае збор грыбоў, ягад, лоўлю рыбы. Потым усё гэта гатуецца на кастры. Такія вылазкі сталі ў сям'і вельмі папулярныя.

Жаданне рабіць дабро

У конкурснай праграме быў прадстаўлены сацыяльны праект, якім сям'я Саўчукоў займаецца не адзін год. Ён накіраваны на сацыялізацыю і развіццё дзяцей у дзіцячых дамах, маладых інвалідаў, дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі.

Вольга, якая пасля дэкрэту занялася рамесніцкай дзейнасцю, звязалася з кіраўнікамі сацыяльных устаноў і прапанавала правесці майстар-клас. Пасля таго як урок паспяхова прайшоў у Гродзенскім дзіцячым доме, Вольга стала працягваць гэту работу ў інтэграваных класах школы і ў Доме дзённага наведвання маладых інвалідаў. Там разам з імі займалася вырабам дэкаратыўных свечак і мыла.

«Ад таго, што ты камусьці дапамог, зрабіў жыццё гэтых людзей больш разнастайным, і самому на душы становіцца прыемна. Да таго ж і нашы дзеці далучаюцца да гэтага праекта».

— Ад таго, што ты камусьці дапамог, зрабіў жыццё гэтых людзей больш разнастайным, і самому на душы становіцца прыемна. Да таго ж і нашы дзеці далучаюцца да гэтага праекта, дапамагаюць у падрыхтоўцы, прыўносяць неабходныя складнікі, часам і самі нешта майструюць. Муж заўсёды «на падвозе», ніколі не адмаўляе, — зазначае суразмоўніца.

«Дзяцей таксама імкнуцца прывучаць да працы на зямлі. І гэта дае свой плён — яны з нецярпеннем чакаюць новы бульбяны сезон, каб далучыцца да такога старажытнага квэсту».

Трэба сказаць, што валанцёрская дзейнасць пачалася ў Вольгі яшчэ са студэнцкіх часоў, калі яна ў складзе добраахвотных памочнікаў Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа займалася інструктажам ВІЧ-хворых. Людзі былі з няпростымі і драматычнымі лёсамі. Спачуванне выклікала жаданне дапамагчы ім. Вольга стараецца сабраць вакол сябе такіх жа неабыякавых і працягвае працаваць з сацыяльнымі ўстановамі. Адметна, што такое супрацоўніцтва ідзе на карысць выхаванцам.

«Дзіцячы» складнік праграмы

Падчас конкурсу юныя ўдзельнікі прадэманстравалі некаторыя свае захапленні. Аказалася, што кожны мае не адно, а некалькі самых разнастайных хобі. Так, старэйшая васьмікласніца Ксенія іграе на фартэпіяна, спявае, з'яўляецца стыпендыятам Беларускага дзіцячага фонду, сярэбраным прызёрам рэспубліканскага вакальнага конкурсу «Юныя таленты Беларусі». На конкурсе Ксенія ўразіла сваім выступленнем па чырлідынгу. І гэта зразумела: турніраў. Бацька бачыць у ім будучага прафесійнага футбаліста.

Малодшы Данііл любіць праводзіць розныя даследаванні і марыць стаць навукоўцам. Ён таксама дружыць са спортам — займаецца футболам, плаваннем і шахматамі. Спартыўны ўхіл прывівае сынам Уладзімір, які і сам любіць гуляць у футбол, захапляецца хуткасным манеўрыраваннем. На пачатку сваёй кар'еры быў найлепшым старшым інспектарам ДПС Беларусі, цяпер працуе механікам на прадпрыемстве.

Калі разам у радасць

Гісторыя знаёмства маіх суразмоўцаў пачалася яшчэ з юнацтва, калі Вольга і Уладзімір вучыліся на правы кіроўцаў. Потым было яшчэ некалькі выпадковых сустрэч, пакуль

яна неаднаразовы пераможца чэмпіянату Беларусі ў гэтым відзе спорту, сярэбраны прызёр на Усерасійскім фестывалі па чырспорце. Па словах Вольгі, дзяўчына вельмі адказная, за ўсё перажывае. Ва ўсім любіць дакладнасць і парадак, як і яе бабуля-настаўніца. Пры гэтым максімальна самастойная і ўмее размяркоўваць свой час.

Сярэдні сын Мікіта — поўная супрацьлегласць старэйшай сястры. Па словах бацькоў, ён заўсёды на пазітыве, любіць пажартаваць, усё робіць хутка. Між тым у падлетка таксама нямала дасягненняў. Ён член зборнай каманды па футболе «Белкард», якая неаднаразова станавілася пераможцам і прызёрам абласных і рэспубліканскіх лёс нарэшце не звёў іх на агульным турнірлёце. У дзень нараджэння Вольга пажадала яму сустрэць каханне на ўсё жыццё. Як ажаніліся, сталі разам прыязджаць да яе бацькоў, дзе збіраліся іх дзеці і ўнукі. Валодзі, які быў адзіным сынам у бацькоў, вельмі падабалася атмасфера вялікай сям'і, дзіцячы гоман, мітусня, агульны вясёлы настрой. Таму маладая сям'я вырашыла, што ў іх будзе трое дзяцей. Такому рашэнню паспрыяла і стаўленне дзяржавы да шматдзетных сем'яў. Па словах Вольгі Саўчук, яны скарысталіся сваімі льготамі на атрыманне кватэры, дзяржава ўзяла на сябе большую частку выдаткаў па выплаце крэдыту. У школе для дзяцей бясплатнае харчаванне, што таксама немалаважна. А мікраграён Альшанка, дзе жыве шматдзетная сям'я, хоць і самы аддалены ў Гродне, мае ўсю неабходную інфраструктуру. Сучасная школа, спартыўныя залы, вялікі гандлёвы цэнтр. Сям'я часта праводзіць вольны час разам.

З усімі сем'ямі фінальнага конкурсу склаліся вельмі добразычлівыя адносіны. Разам праводзілі вольны час і нават адсвяткавалі дні нараджэнняў двух дзяцей.

— Калі нарадзіліся дзеці, мы імкнуліся стварыць такую атмасферу, каб яны бачылі ў сям'і ўзаемадапамогу і спрыяльны мікраклімат. Наш тата не стаіць у баку ад сямейных абавязкаў. Больш за тое, па дапамогу дзеці, як правіла, ідуць часцей да яго. Напрыклад, на выхадныя ён гатуе ежу, дзеці вельмі любяць яго стравы і таксама падключаюцца да працэсу, ён можа і адбіўных пасмажыць, і пюрэ зрабіць. Няма такога, што хтосьці галоўны, а хтосьці — не. Усе сямейныя абавязкі выконваюцца абаімі бацькамі, — расказвае аб сямейным укладзе Вольга.

Яна не ўтойвае, што ў іх, як у многіх сужэнцаў, быў свой складаны перыяд. Але аддае даніну Уладзіміру, які заўсёды рабіў першы крок да прымірэння. Гэта адыграла значную ролю ў захаванні сямейных адносін.

Мяне пацікавіла, што, у сваю чаргу, думае Уладзімір наконт ролі мужчыны ў сям'і. Як вядома, летась нават з'явілася новае свята — Дзень бацькі, якое адзначаецца 21 кастрычніка.

— Мужчына — гэта аснова сям'і і павінен сваім прыкладам паказваць, як трэба жыць у грамадстве. Думаю, што Дзень бацькі таксама гэтаму будзе садзейнічаць. А для мяне свята ў тым, што я — бацька і ў мяне трое дзяцей. Мая жонка ўсміхаецца, значыць, яна шчаслівая, а калі мама ўсміхаецца, у доме пануюць утульнасць і спакой, — выказаў сваю думку суразмоўнік.

Дарэчы, веласіпед, які сям'я атрымала ў падарунак на конкурсе, вырашана аддаць менавіта маме. Цяпер такі транспартны сродак будзе ва ўсіх пяці членаў сям'і Саўчукоў.

Маргарыта УШКЕВІЧ.
Фота дадзена Тэрытарыяльным цэнтрам сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Кастрычніцкага раёна г. Гродна.

Извещение о проведении **20 ноября 2024 года** аукционных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «КЕРАМИН»

Сведения о продаваемом имуществе (предмете торгов)			
Наименование, характеристики и местонахождение продаваемого имущества	Сведения о земельном участке	Начальная цена, с учетом НДС, бел. руб.	Размер задатка, бел. руб.
Капитальное строение с инв. номером 500/С-38333 общей площадью 530,8 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Асаналиева, 48А, (наименование – Молодежный центр «Ритм», назначение – Здание специализированное культурно-просветительного и (или) зрелищного назначения) **с включенным имуществом:** вентиляционная система, 1 шт.; автоматическая установка пожарной сигнализации и система оповещения о пожаре, 1 шт.; кондиционер GSM-71/KXP1V, 1 шт.; кондиционер GSM-71/KXP1V, 1 шт.; шкаф управления DRSU-12-10AC DMX TY BY 192250237.004-2016, 1 шт.; шкаф управления PT 12 DMX TY BY 192250237.004-2016, 1 шт.; шкаф холодильный серии «Рапсодия»R 1400M, 1 шт.; стойка 4000*1965*1100 дуб Канзас коричневый, 1 шт.; вывеска «Молодежный центр Ритм», 1 шт.; шкаф ВРУ-1, 1 шт.; велопарковка на 3 места МЦ Ритм (019670), 1 шт.; жалюзи вертикальные (5112501), 9 шт.; жалюзи горизонтальные (5111781), 1,67 м2; зеркало состар. 1850*720 мм (019904), 4 шт.; комплект зеркал (019905), 1 компл.; комплект штор р-р 2,50 (019839), 4 шт.; лампа строб е27 D50мм, прозрачный (028582), 158 шт.; насос погружной для слабозагрязненной воды MAKITA PF 0410* (036224), 1 шт.; огнедержание деревянное (029082), 1 шт.; светильник ЛПО 4Х18 (3465676), 4 шт.; светильник СУЗОРЬЕ 9 (3465699), 3 шт.; СЕЙФ (5116193), 1 шт.	Площадь – 0,3449 га, кадастровый номер – 500000000004000955	3 090 000,00	309 000,00

Продавец имущества: ОАО «Керамин», ул. Серова, 22, комн. 1, 220024, г. Минск.

Организатор торгов: государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

Условия торгов: победитель торгов (покупатель) в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона в размере 1 (одного) процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «КЕРАМИН», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, в том числе индивидуальные предприниматели, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» р/с BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, кодификатор назначения платежа – 40901, назначение платежа – задаток для участия в аукционных торгах 20.11.2024 по продаже имущества, принадлежащего ОАО «КЕРАМИН».

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае, если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 15 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся **20 ноября 2024 года в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 7 (зал аукционов).

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 17.10.2024 по 18.11.2024** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.00) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

По вопросу ознакомления с продаваемым имуществом следует обращаться по телефону: (029) 392-50-94.

Телефоны для справок: (017) 365-48-36, 360-42-22 (государственное предприятие «МГЦН»); (017) 219 26 26 (ОАО «КЕРАМИН»). Дополнительная информация размещена на сайте **www.mgcn.by** в разделе «Недвижимость в собственность».

ИЗВЕЩЕНИЕ О НАЛИЧИИ ОСНОВАНИЙ ДЛЯ ПРИЗНАНИЯ ЖИЛОГО ДОМА ПУСТУЮЩИМ

Дмитровичский сельский исполнительный комитет извещает, что постоянно действующей комиссией по обследованию состояния жилых домов, расположенных на территории Березинского района, в ходе обследования выявлен жилой дом, расположенный по адресу: **Минская область, Березинский район, д. Меденка, ул. Центральная, д. 5** (полный адрес указан согласно похозяйственных книг), **имеющий основания для признания его пустующим.**

Сведения о жилом доме (из акта):
Наружные размеры одноквартирного, жилого дома: 7 х 8 м.
Площадь: 56,0 кв. м.
Дата ввода в эксплуатацию одноквартирного жилого дома: 1950 г.
Материал стен: дерево, обшито доской.
Этажность: одноэтажный.

На придомовой территории не осуществляются предусмотренные законодательством мероприятия по охране земель.

Не соблюдаются требования к содержанию (эксплуатации) территории.

Одноквартирный, жилой дом находится в неудовлетворительном состоянии.

Сведения о лицах, включая наследников, которым предположительно одноквартирный, жилой дом принадлежит на праве собственности, хозяйственного ведения или оперативного управления, иных лицах, имеющих право владения и пользования им (ей), Лященко Зинаида Григорьевна – умерла 14.10.2015.

Предположительный срок непроживания в одноквартирном, жилом доме собственника, иных лиц, имеющих право владения и пользования этим домом: более 3-х лет.

От лиц, имеющих право пользования жилым домом, в Дмитровичский сельский исполнительный комитет не поступило уведомлений о намерении использовать такой дом для проживания.

Дмитровичский сельский исполнительный комитет просит всех заинтересованных лиц в течение двух месяцев со дня опубликования извещения, уведомить Дмитровичский сельский исполнительный комитет о намерении использовать пустующий дом для проживания.

Телефоны для справок: 801715 31420, 801715 31646, 8029 7197889.

УНП 600036574

О ПОИСКЕ ПРАВООБЛАДАТЕЛЕЙ ОДНОКВАРТИРНОГО ЖИЛОГО ДОМА

д. Меденка, ул. Центральная, 5
Березинского района Минской области

Дмитровичский сельский исполнительный комитет в целях реализации Указа Президента Республики Беларусь от 24 марта 2021 г. № 116 «Об отчуждении жилых домов в сельской местности и совершенствовании работы с пустующими домами» разыскивает собственников, наследников и лиц, имеющих право пользования жилым домом: Минская область, Березинский район, д. Меденка ул. Центральная, 5 (полный адрес указан согласно похозяйственных книг).

Сельисполком просит граждан, располагающих информацией о собственниках, наследниках и лицах, имеющих право пользования жилым домом, о месте их фактического проживания, сообщить в Дмитровичский сельисполком по телефонам: **801715 31420, 801715 31646, 8029 7197889** (с 8.00 до 17.00 по рабочим дням).

Также информацию можно прислать по адресу: **223320, Минская область, Березинский район, д. Дмитровичи, ул. Школьная, 4.**

Электронный адрес: **dmitrovss@berezino.gov.by**

УНП 600036574

ИЗВЕЩЕНИЕ О НАЛИЧИИ ОСНОВАНИЙ ДЛЯ ПРИЗНАНИЯ ЖИЛОГО ДОМА ПУСТУЮЩИМ

